ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 45 (1119) 9 лістапада 2013 г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

КАДРЫ Ў ЗОЛАЦЕ, СРЭБРЫ І БРОНЗЕ

Майстар-класы, прэзентацыі, творчыя сустрэчы і, вядома ж, кіно... "Лістапад-2013" — гэта лавіна ўражанняў, патрапіць у якую, з аднаго боку, — вялікая удача, з іншага ж — сапраўдная прыгода. Як перабрацца з адной пляцоўкі на іншую, паспець паглядзець галоўныя карціны асноўных конкурсаў, дазнацца, што адбываецца ў конкурсах маладога дакументальнага кіно, "Лістападзіка", зазірнуць на пэўны майстар-клас... Убачыць Кіру Муратаву — і ўзрадавацца, пазнаёміцца з Клэр Дэні — і зачаравацца, дазнацца больш пра кіно Брыйанты Мяндосы — і захапіцца... Словам, "Лістапад" — гэта лавіна эмоцый, інфармацыі і досведу, і прааналізаваць яго ў некалькіх артыкулах — справа зусім не лёгкая. Але мы ўсё ж паспрабуем...

Пачатак — у наступным нумары з беларускіх акцэнтаў "Лістапада-2013".

На здымках — кадры з фільмаў:

1. "Іда" ("Золата "Лістапада", "Серабро "Лістапада");
2. "Па крузе" ("Бронза "Лістапада");
3. "Кіндарвілейскі прывід" (Прыз глядацкіх сімпатый "Залаты "Лістападзік");
4. "Бацька і сын" (Гран-пры "За лепшы дакументальны фільм");
5. "Клара і мядзведжыя таямніцы" (Прыз за лепшы фільм для дзяцей).

Чаму прыватны музей не шукае "легалізацыі"? С. 4 — 5, 12

Мадэлі бібліятэк будучага: ці рэальная іх будучыня? С. 10 — 11

Рэакцыя на рэдакцыю: **што цікавіць чытачоў у Сеціве?** С. 4 — 5

Творчыя прэміі: як не наступіць **на "граблі" суб'ектывізму?** С. 4

Каму належыць **аўтарскае права на спектакль?** С. 5

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Шукае працу генератар ідэй!

ПРАЦАвіТЫ

А патрабуецца хто?

Бавіць вольны час студэнт можа па-рознаму, у тым ліку з карысцю для сваёй кар'еры. Нават учарашні абітурыент, а сёння — першакурснік, у стане не толькі авалодваць тэарэтычнымі ведамі — ад універсітэцкіх выкладчыкаў ды падручнікаў, — але і назапашваць досвед працы па вызначанай спецыяльнасці. Студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў дапамагчы ў гэтым мусіць праект "ПРАЦАвіТЫ", арганізаваны 5 лістапада, дарэчы, па ініцыятыве тых жа студэнтаў. Адразу скажам: праект — дэбютны. А таму было вырашана для пачатку запрасіць да ўдзелу студэнтаў факультэта культуралогіі і менеджменту сацыяльна-культурнай сферы БДУКіМ, а таксама патэнцыйных працадаўцаў, арэал якіх абмяжоўваецца пакуль беларускай сталіцай. Мы паспрабавалі даведацца, на што разлічваюць першыя і што могуць прапанаваць другія...

С. 7

КАРАЛЕВА СОФ'Я: НАПЯРЭДАДНІ ПРЭМ'ЕРЫ

Фота Юрыя ІВАНОВА

С. 3

Дні культуры

З кім Ротка сустрэнецца ў Віцебску?

У Віцебску пройдуць Дні Латвіі. 14 лістапада ў рамках Дзён адбудзецца падпісанне дамовы аб супрацоўніцтве паміж даўгаўпілскім Арт-цэнтрам Марка Роткі і віцебскім Арт-цэнтрам Марка Шагала.

Абодва творцы з'яўляюцца класікамі XX стагоддзя, але Ротка ў нашай краіне вядомы менш за Шагала. Ён нарадзіўся ў Даўгаўпілсе (тады той называўся Дзвінскам, але належыў да нашых земляў у складзе Расійскай імперыі), а творчую кар'еру здзейсніў за акіянам. Аматары мастацтва спадзяюцца, што супрацоўніцтва арт-цэнтраў паспрыяе папулярызацыі творчасці Роткі ў Беларусі і Шагала ў Латвіі.

Тыя ж, хто тым днём прыйдзе на канцэрт "Танга над горадам" у Канцэртнай зале "Віцебск", змогуць яшчэ паглядзець і мастацкую выстаўку "Петэрыс Марцінсонс. Даўгаўпілс", разгорнутую ў фае. Аснову ж канцэрта складуць лепшыя творы кампазітара Аскара Строка, прызнанага пры жыцці "каралём танга". Сёлета — 120 гадоў з дня нараджэння маэстра. У гонар ягонага юбілею будуць граць Даўгаўпілскі аркестр акардэаністаў, спяваць — артысты Латвійскай оперы і джаза.

Петэрыс Марцінсонс — мастак-кераміст, які да справы свайго жыцця прыйшоў няпростым шляхам. Пачынаў як інжынер-тэхнолаг, быў архітэктарам. А потым ад сферы, дзе пануе функцыяналізм, прыйшоў да фармальнай свабоды, якую ўвасабляе мяккая гліна. Атрымаўся цікавы сінтэз, што ўразіў яго суайчыннікаў і замежнікаў. Вялікая калекцыя твораў гэтага майстра належыць Арт-цэнтру Марка Роткі.

Адбудзецца і прэзентацыя праекта "Даўгаўпілс запрашае". Яго мэта — прывабіць турыстаў з Беларусі ды краін СНД, звязаць турыстычным маршрутам Віцебск і Даўгаўпілс.

Фестывалі

Беларуская Мельпамена скарыла Украіну

Два беларускія тэатры — сталічны і маладзечанскі — сабралі мноства прызоў, уключаючы Гран-пры, на VII Тэатральным фестывалі Міжнароднага чарнаморскага клуба "Homo ludens" ("Чалавек, які іграе"), што прайшоў у кастрычніку ў Нікалаеве (Украіна).

Адна з журналісцкіх публікацый, прысвечаных фестывалю, так і называлася: "Нікалаеўскі трыумф артыстаў з Беларусі". Галоўны поспех прыпаў на долю Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Яго спектакль "Адвечная песня" ў пастаноўцы Сяргея Кавальчыка, які мы ўспрымаем ужо як сучасную нацыянальную класіку і адно з лепшых увасабленняў купалаўскай творчасці, атрымаў Гран-пры. Асабліва прыемна, што наконт гэтага супалі рашэнні абодвух журы — асноўнага і альтэрнатыўнага (журналісцкага). Акрамя таго, пераможцам у намінацыі "Лепшая жаночая роля другога плана" была прызнана, на думку асноўнага журы, Бэла Шпінер (Восень). Удзельнікі спектакля атрымалі таксама дыплом "За лепшы акцёрскі ансамбль" ад альтэрнатыўнага журы. Нашай фольк-рок-оперы была прысвечана падрабязная, вельмі разгорнутая інтэрнэт-рэцэнзія (а не сціслая фотасправаздача, заўважым, як гэта бывае на падобных форумах у нас).

Мінскі абласны драматычны тэатр вазіў у Нікалаеў сваю не менш легендарную "Камедыю" — і не менш паспяхова. У спектаклі былі адзначаны ледзь не ўсе выканаўцы. Абодва журы прызналі, што "Лепшая мужчынская роля" атрымалася ў Аляксандра Пашкевіча, які іграў Селяніна. Асноўнае журы ўзнагародзіла таксама Сяргея Карзая (Давід) — за "Лепшую мужчынскую ролю другога плана". У сваю чаргу, альтэрнатыўнае журы назвала Алега Чэчанева (Чорт) "Улюбёнцам публікі".

— Паездка ў Нікалаеў, — распавёў дырэктар Мінскага абласнога драматычнага тэатра Юрый Крывенькі, — была ўжо не першай нашай вандроўкай ва Украіну. Летась мы, як і мазырскі тэатр імя Мележа, ездзілі ў Нежын — на VIII Міжнародны тэатральны фестываль жаночай творчасці імя Марыі Занькавецкай. І разам з прызам "За лепшы жаночы акцёрскі дуэт" у пастаноўцы "Шукаю сапраўднага мужчыну" прывезлі шмат іншых запрашэнняў. Адно з іх і было рэалізавана зараз. Дарэчы, на фестываль "Homo ludens" нас паклікалі і на наступны год. Ёсць прапановы і з Кіева. Але на цяперашнім этапе самае галоўнае для нас — добра падрыхтавацца да Міжнароднага фестывалю нацыянальнай драматургіі ў Бабруйску, які пройдзе ў снежні. Мы павязём туды спектакль "Падобны на Стынга" Ірыны Пісьменнай у пастаноўцы мастацкага кіраўніка нашага тэатра Мікалая Дзіянава...

Надзея БУНЦЭВІЧ

Увага!

"ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ"

Газета "Культура" працягвае традыцыю "гарачых ліній". Гэтым разам сустрэча з кампетэнтным суразмоўцам будзе прысвечана "болевым" кропкам, выяўленым пад час сёлетняга аўтатура "К". На актуальныя пытанні чытачоў адкажа сенатар, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дырэктар Палаца культуры Маладзечна **Святлана Рыгораўна САРОКА**.

Задаць сваё пытанне можна будзе ў аўторак, **12 лістапада, з 14-й да 15-й гадзіны** па тэлефонах "гарачай лініі" **+375-17-290-22-50** (гарадскі) і **+375-33-334-999-3** (мабільны), а таксама загадзя, даслаўшы свой допіс на адрас электроннай пошты **kultura@tut.by**, і на нашых старонках у сацыяльных сетках: facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby.

Культурны твітар: мы ў свеце

Венгрыя

У Венгерскім дзяржаўным саюзе журналістаў адкрылася выстаўка беларускага мастацтва. У экспазіцыі прадстаўлены тры розныя жанры: праект "Культурны плакат" Уладзіміра Цэслера, графіка выпускнікоў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і малюнкі дзяцей — прызёраў міжнароднага конкурсу "Вясёлка", які кожныя два гады праводзіцца ў венгерскім горадзе Занка.

Расія

Маладзёжны беларуска-расійскі сімфанічны аркестр завяршыў гастрольны сезон выступленнем у Калузе. Арганізатарамі канцэртнага тура сталі Беларуская дзяржаўная філармонія і маскоўскі Цэнтр міжнародных конкурсаў. Кіруюць калектывам дырыжоры з Беларусі і Расіі: Андрэй Галанаў і Вячаслаў Валееў. Таксама сёлета аркестр даў канцэрты ў Мінску, Кембрыджы і Лондане.

Нацыянальны культурны цэнтр беларусаў "Бацькаўшчына" прыняў удзел у VIII Штогадовым Курганскім гарадскім фестывалі нацыянальных культур "Вянок дружбы". На сцэне Палаца дзіцячай (юнацкай) творчасці горада Кургана адбыўся гала-канцэрт, дзе былі выкананы песні і танцы народаў, якія пражываюць у Заураллі.

Кітай

Пасольства Беларусі прадставіла свой павільён на дабрачынным кірмашы, што адбыўся ў пекінскім парку "Чаоян". Каля павільёна быў зладжаны майстар-клас па вязанні. Госці кірмашу маглі на свае вочы ўбачыць, як беларускія майстрыхі ствараюць сапраўдныя творы мастацтва, а таксама набыць прадметы рукадзелля. Атрыманыя ад продажу тавараў сродкі пойдуць на будаўніцтва рэзервуараў для вады ў пацярпелых ад землятрусу раёнах правінцыі Юньнань.

Літва

Адкрыццё выстаўкі "Максім Танк. Гартаючы жыцця свайго старонкі...", а таксама фота-пленэру, прысвечанага жыццю і творчасці беларускага паэта, адбылося ў Доме-музеі сям'і Венцлава ў Вільні. На адкрыцці выступілі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын, дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Лідзія Макарэвіч. На вернісажы таксама прысутнічалі прадстаўнікі грамадска-культурных колаў Літвы, беларускай дыяспары.

Падрыхтавала Вольга НАВІЦКАЯ

Камертон

Здымайце камерны на камеру!

8 лістапада ў Мінску адкрыўся III Міжнародны конкурс выканаўцаў на струнных інструментах імя М.Ельскага. А 5-га ў Смаргоні завяршыўся X Міжнародны конкурс камерных ансамбляў і струнных квартэтаў імя М.К. Агінскага. Беларускія калектывы выступілі даволі паспяхова, атрымаўшы ў розных намінацыях другія і трэція прэміі, а таксама дыпломы. Чым жа вылучалася юбілейнае спаборніцтва, якія ў яго перспектывы? Думкамі пра гэта падзяліліся члены журы і аргкамітэта.

— Я вельмі рады, — сказаў старшыня журы конкурсу, мастацкі кіраўнік Беларускай дзяржаўнай філармоніі, прафесар Юрый ГІЛЬДЗЮК, — што паехаў менавіта ў Смаргонь, хаця меў на гэтыя ж дні даволі прывабныя запрашэнні ў Сімферопаль, ва Украіну. Гэты конкурс вельмі важны для развіцця нашай нацыянальнай культуры, бо камерны ансамбль дапамагае не толькі слухаць, але і чуць партнёра (як у музыцы, так і ў жыцці), павялічвае эрудыцыю ды творчы патэнцыял любога мастака. Таму хочацца выказаць вялікую падзяку арганізатарам форуму. І ў першую чаргу — Смаргонскаму райвыканкаму ды тамтэйшай Школе мастацтваў імя Агінскага, што ўзяла на сябе асноўныя клопаты па правядзенні свята.

Для беларускіх удзельнікаў сёлетні конкурс праходзіў у складаных умовах. Ён павінен быў адбыцца ўвесну, але з-за конкурсу Ельскага перакінуўся на восень. А потым і тое спаборніцтва давялося пераносіць — і конкурсы зноў амаль супалі па часе. З-за гэтага камусьці з музыкантаў давялося выбіраць адзін конкурс з двух, а камусьці — з аднаго ехаць адразу на другі. З-за такога супадзення тэрмінаў мы не змаглі, як калісьці, правесці канцэрт лаўрэатаў у Мінску, у філармоніі. А паслухаць там было каго і што — невыпадкова зала стоячы вітала лаўрэатаў!..

Меркаванні іншых членаў журы і аргкамітэта конкурсу чытайце на стар. 9.

Фотафакт

У галерэі Савіцкага

На чарговай выстаўцы Студыі ваенных мастакоў "Традыцыя" ў Галерэі Міхаіла Савіцкага.

На здымку: генерал-лейтэнант І.Вяльджанаў ля свайго партрэта пэндзля Мікалая Апіёка з будучымі абаронцамі Айчыны.

Фота Юрыя ІВАНОВА

31 кастрычніка 2013 г. пайшоў з жыцця прафесар установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь Станіслаў Іосіфавіч ДРОБЫШ.

Больш за 30 гадоў Станіслаў Іосіфавіч узначальваў кафедру беларускай народна-песеннай творчасці ўніверсітэта. Ён шчыра дзяліўся ведамі з моладдзю. Праявіў сябе таленавітым педагогам, які стварыў сваю школу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне народна-песеннай творчасці. Ягоныя выхаванцы плённа працуюць ва ўсіх кутках нашай краіны. З яго імем звязана стварэнне вядомага вакальна-харэаграфічнага ансамбля "Валачобнікі" — лаўрэата і дыпламанта шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў, выступленні якога нязменна мелі вялікі поспех.

Станіслаў Іосіфавіч актыўна ўдзельнічаў у рабоце камісій і журы разнастайных конкурсаў і фестываляў, садзейнічаў выяўленню і падтрымцы таленавітай моладзі.

У нашых сэрцах назаўсёды застанецца добрая памяць аб Станіславе Іосіфавічы Дробышу як выдатным арганізатары, цудоўным і таленавітым педагогу, сапраўдным майстры і адказным грамадзяніне.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў смуткуюць з прычыны смерці Станіслава Іосіфавіча Дробыша і выказваюць спачуванні яго родным і блізкім.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці КУЗЬМІЧА Аляксея Васільевіча — славутага мастака Беларусі, і выказвае спачуванні родным і блізкім мастака.

Светлая памяць аб Кузьмічы Аляксеі Васільевічы назаўсёды застанецца ў сэрцах родных, блізкіх, калег і сяброў.

Калектыў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім сям'і Раманоўскіх у сувязі з напаткаўшым іх горам — смерцю Інэсы РАМАНОЎСКАЙ.

Фотасюжэт нумара

Каралева Соф'я

Перад прэм'ерай нацыянальнага мюзікла "Соф'я Гальшанская" кампазітара Уладзіміра Кандрусевіча ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры наш фотакарэспандэнт Юрый ІВАНОЎ пабываў на рэпетыцыі спектакля.



Трэба абмеркаваць!

Як зрабіць дабрачынную латарэю на карысць Навагрудскага замка больш эфектыўнай?

Традыцыі дабрачынных латарэй — не адно дзесяцігоддзе. У розных краінах свету такім чынам адбываецца збор сродкаў на сацыяльныя і культурныя праекты. Да прыкладу, у нашай краіне ўжо не першы год праводзіцца латарэя "Скарбніца", сродкі ад якой ідуць выключна на рэстаўрацыю Навагрудскага замка. Апошні па часе, 31 тыраж "Скарбніцы" адбыўся некалькі тыдняў таму. Але наколькі эфектыўнае правядзенне такой латарэі для збору сродкаў на адраджэнне гістарычных каштоўнасцей?

Кастусь АНТАНОВІЧ, рэдактар аддзела газеты "Культура":

— Калі ёсць магчымасць арыгінальным чынам далучыцца да добрай справы, то чаму б і не? Відавочна, сабраных падобным чынам грошай не хопіць на ўсе рэстаўрацыйныя работы, але ж і такая фінансавая падтрымка, перакананы, будзе не лішняй. Іншая справа — хочацца, каб і прызы для ўдзельнікаў "Скарбніцы" мелі таксама нацыянальны каларыт: вырабы народных майстроў, пуцёўкі на адпачынак і падарожжы па беларускіх палацах. Прынамсі, сярод іншых даброт кшталту бытавой тэхнікі. Думаецца, арганізатарам "Скарбніцы" трэба ўлічваць і ўзаемасувязь колькасці ўдзельнікаў ды бюджэту латарэі. А таму для павелічэння продажу білетаў трэба праводзіць больш "агрэсіўную" рэкламную кампанію, бо апошнім часам інфармацыю пра "Скарбніцу" можна знайсці, ды і то выпадкова, хіба што ў асобных аддзяленнях "Белпошты", не ў самым прыкметным месцы, на жаль...

Антон АСТАПОВІЧ, старшыня Беларускага дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры:

— Правядзенне "Скарбніцы" — справа адназначна карысная, нават калі даходы ад латарэі і не вельмі вялікія. Галоўная функцыя "Скарбніцы" — асветніцкая. Яе правядзенне — адзін з крокаў па заахвочванні, далучэнні грамадства да аховы нашай культурнай спадчыны. Да прыкладу, у 2009 годзе каштарыс на рэстаўрацыю Навагрудскага замка складаў 9 мільярдаў рублёў. І калі б кожны жыхар нашай краіны ўклаў у гэтую справу ўсяго адну тысячу, унікальны гістарычны помнік сёння мог бы прымаць сотні тысяч турыстаў з усяго свету... А таму хацелася б, каб "Скарбніца" стала нацыянальнай латарэяй, са сваімі джэк-потамі ды годнай рэкламай. Зразумела, што за правядзеннем любой масавай латарэі стаіць прафесійная і нятанная прамоцыя. Таму і карыстаюцца сёння папулярнасцю ў насельніцтва не "Скарбніца", а больш прывабныя па прызах ды тэрмінах правядзення штотыднёвыя "лато". Вельмі спадзяюся, што расклад сіл у гэтых латарэях з цягам часу зменіцца. Прынамсі, і я, і мае шматлікія сябры неаднаразова набывалі латарэйныя білеты розных тыражоў "Скарбніцы". І няхай сабе выгрышы ў нас былі сімвалічнымі — мы не засталіся расчараванымі.

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на www.facebook.com/kimpressby, www.vk.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

Вяртаючыся да надрукаванага

"Чытай, мікраараён!"

Мы атрымалі ліст, у якім наша чытачка працягвае гаворку, распачатую ў артыкуле "К" "Бібліятэка, якую нельга зачыніць?" (№ 43).

Звыш дваццаці гадоў я працую на пасадзе загадчыка адной з дзіцячых бібліятэк Светлагорска. Вельмі цікаўлюся падзеямі ў бібліятэчным жыцці, многае з таго, аб чым прачытала, імкнуся скарыстаць у прафесійнай дзейнасці. Неаднаразова дзялілася вопытам работы на старонках розных часопісаў і газет. Але ўпершыню адважылася даслаць на ваш адрас ліст, у якім распавяла аб адным з праектаў нашай бібліятэкі. Гэта мой адказ на пытанне, што ўзнята ў адным з нумароў "Культуры": "Якой павінна быць бібліятэка, каб яе не закрылі?".

Як вы мяркуеце, ці можна зрабіць чытачамі насельніцтва асобна ўзятага мікраараёна? Упэўнена, на гэтае пытанне большасць адкажа адмоўна. Супрацоўнікі Дзіцячай бібліятэкі № 6 Светлагорска рызыкнулі вырашыць гэтую складаную задачу. У Кастрычніцкім мікраараёне, на тэрыторыі якога знаходзіцца ўстанова, распачалася рэалізацыя праекта "Чытай, мікраараён!". Галоўная яго мэта — павелічэнне колькасці карыстальнікаў бібліятэкі і далучэнне новага пакалення да кнігі ды рэгулярнага чытання. Дарэчы, ініцыятыву нашу падтрымалі Дом дзіцячай і юнацкай творчасці "Ювента", Дыягнастычны цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, гарадская школа № 4 і ўсе дашкольныя ўстановы, якія размешчаны ў мікраараёне. Пачаткам праекта стала арганізацыя ў дзіцячых садках бібліятэчак кніг для дашкалят і выставак-аглядаў улюбёных выданняў дзятвы.

Бібліятэкары таксама распрацавалі змястоўную праграму разнастайных мерапрыемстваў, разлічаных на розныя ўзроставыя групы наведвальнікаў. Так, да прыкладу, для выхаванцаў дзіцячых садкоў і дзяцей-інвалідаў яны правялі экскурсіі па бібліятэцы пад назвай "Кніганавічок і кампанія". Кожная экскурсія завяршалася інтэрактыўнай гульнёва-пазнавальнай праграмай, у якой у якасці вядучай выступіла гаворачая лялька, а таксама конкурсам загадак, аглядам вясёлых і цікавых дзіцячых часопісаў ды газет. Працягам праекта стала ўрачыстае пасвячэнне ў чытачы 65 першакласнікаў. Кожны з іх атрымаў памятны медаль з надпісам "Чытач бібліятэкі" і памяткі з парадамі, што датычыліся беражлівага стаўлення да кніг і таго, як належыць паводзіць сябе ў бібліятэцы.

Актыўнымі ўдзельнікамі праекта сталі навучэнкі старэйшых класаў. Дзевяцікласніцы з задавальненнем прынялі прапанову стаць "бібліятэкарам на гадзіну". Яны паспрабавалі сябе ў якасці работнікаў абанемента, чытальнай залы. Як і сапраўдныя бібліятэкары, дзяўчаты абслугоўвалі наведвальнікаў рознага ўзросту, праводзілі агляды кніжных выставак "Апетытнае кнігачытанне", "Час чытаць на роднай мове" , "Вясёлы кнігавоз", "Забытыя кнігі жадаюць пазнаёміцца", рэкламавалі новыя выданні з "Куфэрка непрачытаных кніг". Асаблівую цікавасць у школьнікаў выклікала экспазіцыя кніг-доўгажыхароў "Скарбы нашай бібліятэкі", дзе былі прадстаўлены амаль сорак выданняў на беларускай і рускай мовах 40 — 50 гг. мінулага стагоддзя.

Ахвотныя абменьваліся на абанеменце асабістымі выданнямі ў кніжным free-маркеце. Падлеткі з азартам "таргаваліся" на выстаўцы-кірмашы "Кнігі вельмі добрыя я чытаю ад душы", а той, хто выканаў адпаведнае заданне па маршрутным лісце, атрымліваў магчымасць узяць дадому з выстаўкі "Прышчэпка да чытання" кнігу павышанага попыту. Шмат цікаўных атрымалі першыя ўрокі па рамонце кніг пад час майстар-класа "Кнігам — другое жыццё".

Першы этап праекта завяршыўся прабегам бібліяролераў, у час якога навучэнцы 7 — 11 класаў, раз'язджаючы на ролікавых каньках па гарадскіх вуліцах, прапаноўвалі прахожым лістоўкі з запрашэннем наведаць бібліятэку, яе адрасам, кантактным тэлефонам. Другі этап прадугледжвае разнастайныя мерапрыемствы па далучэнні да кнігі і чытання бацькоў, настаўнікаў ды навучэнцаў старэйшых класаў.

Вольга КЛІМЯНОК,
загадчык Дзіцячай бібліятэкі № 6 Светлагорска

Дзяжурны па нумары

Суб'ектыўныя "граблі" чакаюць часу "Х"?

Алег КЛІМАЎ,
спецкарэспандэнт газеты "Культура", лаўрэат I Нацыянальнай музычнай прэміі ў намінацыі "Лепшы музычны журналіст (музычны крытык)"

Музычныя прэміі прыходзяць і сыходзяць, але музыку слухаць хочацца заўсёды. Мабыць, шараговаму меламану больш важная якасць твора, чым тое, якімі ўзнагародамі апошні адзначаны. Але выканаўцы, кампазітары, паэты-песеннікі ды іншыя дзеячы музычнага мастацтва... Праз сваю тонкую душэўную арганізацыю, творцам важны не толькі сам прадукт, але і тое, які водгук ён знайшоў у сэрцах грамадзян і, зразумела ж, калег па цэху. Некаторыя з апошніх (плюс профільныя журналісты/крытыкі), аб'яднаўшыся ўнутры якога-небудзь праекта, і адзначаюць дасягненні сабратаў па рамястве. Ці ігнаруюць іх здзяйсненні.

Сёлета ў трэці раз будзе ўручацца Нацыянальная музычная прэмія, што прыняла эстафету ад музычнай прэміі канала "СТБ". Па 21 лістапада аргкамітэт прымае заяўкі ад саіскальнікаў на атрыманне статуэтак і грашовага бонуса. Першыя дзве цырымоніі выклікалі ў асяроддзі працаўнікоў на ніве музыкі ды яе аматараў меркаванні палярныя. Само сабой, тыя, хто сталі ўладальнікамі прэмій, палічылі вынікі заканамернымі. Абдзеленыя ж увагай пачалі вышукваць усемагчымыя "касякі" ды падводныя камяні, адмаўляючы арганізатарам мерапрыемства ў элементарным прафесіяналізме.

Назіраючы за тым, як рыхтуецца гэтае свята, узгадваю праславутую "Рок-каранацыю". З усімі яе плюсамі і латаннем цёмнага касцюмчыка (прэміі ў галіне беларускага року і альтэрнатыўнай музыкі: у дадзеным выпадку "альтэрнатыва" — творчасць не эстрадная, не папсовая) белымі ніткамі. І які раз хочацца нагадаць паважаным мной людзям, якія займаюцца ўвасабленнем Нацыянальнай прэміі ў жыццё, пра тое, як і чаму (у тым ліку) "…Каранацыя" страціла сваю прыцягальную аўру, упала ў перманентную ліхаманку і ў дадзены момант знаходзіцца ў коме. Бо і там, і тут недахопы я бачу адны і тыя ж, і "граблі" па-ранейшаму чакаюць часу "Х".

У адрозненне ад замежных "аналагаў", скажам, прэмій "Grammy" ды "Brit Awards", дзе пануе фактар аб'ектыўнасці (пераможцамі становяцца артысты, якія больш за іншых зарабілі за справаздачны перыяд і выпусцілі свае работы большымі накладамі), са статыстыкай па гэтай сферы ў Беларусі, з пэўных прычын, — напружана. І пры вызначэнні лепшых з лепшых у нас збольшага кіруюцца "крытэрыем" суб'ектыўным — асабістым густам. Так, "Песню года" яшчэ можна неяк вылічыць, абапіраючыся на даныя пра тое, колькі часу раціраваўся той або іншы трэк на радыёстанцыях. Але, далібог, не разумею, як ва ўмовах роднага так званага шоу-бізнесу вызначыць "Лепшы гастрольны тур"! Больш за тое: я зламаў бы галаву над дылемай, каго абраць "Лепшым поп-выканаўцам (калектывам)"! Менавіта нашай краіны!

Вось Дзмітрый Калдун — ён наш ці не? Не трэба толькі кідаць у мяне камяні! Па пашпарце артыст з'яўляецца, спадзяюся, грамадзянінам Беларусі. А па выкарыстанні творчых сіл? А ў адным з небеларускіх тэлепраектаў Дзмітрый прадстаўляў… Расію. Умоўнасці? Яны добрыя ў меру. Што ўжо казаць пра Сярогу, які даўно ва Украіне. Пра "Беларускіх песняроў" я ўвогуле маўчу. А ёсць жа Літвінковіч, Падольская, Лорэнс, ДзіДзюЛя... "Grammy" ды "Brit Awards", да слова, больш за ўсё даставалася на арэхі ад крытыкаў у тых намінацыях, дзе панаваў Яго Вялікасць Суб'ектывізм. Адной з прычын таго, што спыніла існаванне расійская прэмія "Авацыя", сталі суб'ектыўныя моманты ў ацэнцы. Таму арганізатары мерапрыемства маюць дакладна вызначыць крытэрыі, якімі аперыруюць адборачныя камісіі і журы пры вылучэнні намінантаў.

І дакладна вызначыцца з журы, гэтым "разносчыкам" суб'ектывізму! Прапанаваў бы арганізатарам Нацыянальнай усё ж апрабаваць ідэю са стварэннем пры ёй такой "структуры", як Акадэмія, што выконвае ролю членаў журы. У пастаянны склад павінны ўваходзіць агульнапрызнаныя аўтарытэты і прафесіяналы, якія разбіраюцца ды працуюць у сучаснай музыцы тут і зараз, паколькі ацэньваецца апошняя. (І ніякіх мадэльераў і г.д.!) Я не супраць, каб мэтрам былі адведзены свае месцы, але па мінімуме і з правам дарадчага голасу. У журы "Рок-каранацыі" ўваходзілі тыя, хто сабаку на рок-н-роле з'еў, але вельмі даўно, хто ў бягучых падзеях арыентаваўся слаба, спадзеючыся на аўтарытэт, досвед ды інтуіцыю, і іхняе меркаванне падчас раптам аказвалася самадастатковым. І, зразумела, павінен быць падзел на "секцыі": у намінацыях спецыфічных няхай аранжыроўшчыкі судзяць аранжыроўшчыкаў, кліпмейкеры — кліпмейкераў, прадзюсары — прадзюсараў. Кампетэнтнасць — у аснову кута. Чаму здулася "Рок-каранацыя" ў першую чаргу? Таму што страціла давер — з боку музыкантаў, з боку журналістаў ды крытыкаў, і ў канчатковым выніку — з боку меламанаў.

І такія "дробязі", як раскрутка, прасоўванне брэнда "Нацыянальная музычная прэмія". Пры наяўнасці рэсурсу СТБ — сузаснавальніка прэміі — дзіўна бачыць, што на канале цягам года не выходзяць перадачы, прысвечаныя ёй — з хронікай падзей у галіне беларускай музыкі, што няма праграм, створаных у кааперацыі з FM-станцыямі, што ў газетах адсутнічаюць адпаведныя рубрыкі... Усё ж такі праект пазіцыянуе сябе як "галоўная музычная падзея года" — ці гэты слоган ужо не актуальны? "Спяваючыя гарады" — справа добрая і, мабыць, патрэбная. А спяваючая краіна?..

Вось тое нямногае відавочнае (для мяне), што датычыцца Нацыянальнай, чым я вырашыў з вамі падзяліцца напярэдадні шоу. Must go on — ад чыстага сэрца жадаю я прэміі!..

"Кожны абавязаны...", або Чаму афіцыйна не існуе "Эпоха Леніна"?

Музеяў на Беларусі нямала, але... усё адно хацелася б больш. І разнастайней. Ледзь не штотыдзень СМІ ("К", натуральна, не выключэнне) выплёскваюць ідэю стварэння новага крэатыўнага музея, прысвечанага якой-небудзь спецыфічнай тэматыцы. Напрыклад, спадчыне савецкай эпохі.

Пытанне, хто будзе ўвасабляць у жыццё ўсе гэтыя (або іншыя) задумы, пакуль застаецца адкрытым. Дзяржаўны бюджэт, як і рэгіёны, наўрад ці пацягне такія выдаткі, на прагматычных інвестараў надта разлічваць таксама не выпадае, — хіба вельмі рэдкі музей здатны пераўтварыцца ў рэнтабельны турпрадукт. Але застаецца такі рэсурс развіцця, як прыватная ініцыятыва, што грунтуецца перадусім на энтузіязме.

Як паказвае практыка, гэты рэсурс і сапраўды спрацоўвае — не толькі ў іншых краінах, але таксама і ў нас. Але казаць па-ранейшаму можна хіба пра адзінкавыя выпадкі, якія выглядаюць "белымі варонамі" на сучаснай культурнай карце. Як стымуляваць пашырэнне ды прымнажэнне такіх ініцыятыў?

Музей выкінутых рэчаў

Вуліца Катоўскага — тыповы прыклад полацкага Задзвіння і гарадскога прыватнага цэнтра ў цэлым. У такія панурыя мясціны людзі рэдка завітваюць без жыццёвай неабходнасці. Але адзін з дамоў выразна вылучаецца з агульнага масіву: ля яго брамы ды паабапал вузкай дарогі месціцца цэлы пантэон савецкіх павадыроў ды іншай гіпсавай скульптуры таго перыяду, а па-над імі горда лунаюць чырвоныя сцягі.

Гэтая прынада спрацоўвае. За шэсць гадоў працы прыватнага музея "Эпоха Леніна" яго наведала каля дзевяці тысяч чалавек з больш як трыццаці краін. Неблагі паказчык, асабліва калі ўлічыць і геаграфію (удалечыні ад тыповых турмаршрутаў), і брак рэкламы...

— Абяцалі вось указальнікі ўстанавіць, але, як бачыце… — кажа стваральнік "Эпохі…" Мікалай Панкрат.

Затое на інфармацыйным шчыце для турыстаў ля небезвядомага "Цэнтра Еўропы" яго экспазіцыя прадстаўлена. І нават у музейнай сталіцы, якой небеспадстаўна называюць Полацк, гэты "пункт праграмы" не выглядае лішнім. Хаця б таму, што нічыю нішу ён не займае: прамых канкурэнтаў няма, прычым не толькі ў Полацку.

— Уся экспазіцыя — гэта даніна павагі гісторыі краіны і людзям, якія яе стваралі сваімі рукамі, — пачынае экскурсію Мікалай Панкрат. — Не, я ні ў якім разе не ідэалізую тыя часы і тым больш не мару пра іх вяртанне. Чалавек, які пазбаўляецца ад свайго мінулага, не мае сэрца, а той, хто хоча ў яго вярнуцца, — не мае розуму. Але кожная эпоха заслугоўвае павагі!..

У тэму тут і эпіграф Купалы на музейнай шыльдзе: класік заклікае "былое ў думах уваскрашаць" выключна для таго, "каб сеўбу новую пачаць".

Колькі ў гэтым музеі скульптурных партрэтаў Леніна (маленькіх і вялікіх, у дзяцінстве і ўжо з залысінай, бюстаў і ў поўны рост), не памятае нават сам калекцыянер. Толькі дубляў назбіралася дзесьці з паўтары сотні! А ў дадатак — і тысячы іншых артэфактаў той пары.

Прыватны музей не мае метадычнай дапамогі, фінансавання ад дзяржавы і... не жадае "легалізавацца"

Як яны ўсе апынуліся ў адных руках? Гісторыі экспанатаў зазвычай не вельмі рамантычныя.

— Вось гэты бюст я знайшоў на сметніку, гэты, здаецца, таксама, гэты мне аддалі на ўмовах самавывазу, бо ўсё адно выкідаць збіраліся, — пералічвае калекцыянер. — Піянер, якога я памятаю яшчэ з дзяцінства, апынуўся ў Заходняй Дзвіне. Увогуле, можна сказаць, што гэта музей выкінутых рэчаў…

Некаторыя творы манументалістыкі ў "бусік" рупліўца не ўлазяць, і яны схаваны недзе ў таемных месцах да лепшага часу. Але ніхто пакуль гэтыя "скарбы" не шукае: Мікалай Глебавіч дарэмна стукаўся ў дзверы розных кабінетаў з прапановай знайсці для іх нейкае пачэснае месца. Натуральна, не ўсе музейныя прадметы дасталіся задарма. Але калекцыянер ніколі не спыняўся перад выдаткамі. Як фінансавымі (колькі ўжо разоў даводзілася выпраўляцца ў камандзіроўкі?), так і часавымі: музей стаў плёнам сарака гадоў працы! І ў выніку нават 150 квадратных метраў плошчы стала замала — у экспазіцыю трапіла толькі частка калекцыі, а "фонды" занялі ўвесь гараж.

Сцены без даху

Мяркуючы па кнізе водгукаў, спісанай ад вокладкі да вокладкі, турыстаў не менш за экспанаты ўражвае і сама постаць руплівага збіральніка апошніх. Гэта таксама

Рэакцыя на рэдакцыю: якія артыкулы газеты

Да артыкула "Зубрыкі" замест "слонікаў" № 42

Сергей Панизник:

— Можна і "Сафійку" полацкую, і "...ваякаў на грозных канях" зрабіць сувенірамі. А можна і Скарыну да юбілею. (Вунь у Празе ў яго пяро выламалі...) А ў песнях і Жыцень, і Раёк жывуць, бароняць наш каранёвы мелас.

Да артыкула "А хто ты і дзе, "жывы" чытач?" № 37

библиотекарь:

— Так, паважаная Вольга Палунчанка, бібліятэчная дзейнасць патрабуе рэформы ўжо даўно: гэта пачалі абяцаць яшчэ ў сярэдзіне 90-х. Але, на жаль, штатны расклад бібліятэк з якога года памяняць не могуць, улічваючы новыя тэхналогіі і новыя рэаліі нашай працы. Але вы тут ужо на асабістасці пераходзіце, а вас, звярніце ўвагу, ніхто не закранаў, на вашу персону не ўказваў ніхто. Можа, у вашых абласцях і раёнах прыцягваюць іншыя арганізацыі, дык у нашых такіх няма. А я, асабіста я, ніколі не адседжвалася, прыпіскамі не займалася. Няма часу на гэта, зараз яшчэ і ідэалагічную службу пэўным чынам замяняем. Акрамя гэтага, на тыдні — адно-два мерапрыемствы. Да самой пенсіі, а да яе яшчэ далёка, буду займаць актыўную пазіцыю ў сваёй працы. (У нашых раёнах ужо пачаліся масавыя скарачэнні работнікаў культуры.) Вы з'ездзіце нават у самае бліжняе замежжа, у тамтэйшыя бібліятэкі: калі гады два-тры таму яны ад нас адставалі, дык зараз нам за імі паспець бы. І яны ганарацца сваёй працай, ім не скажуць: "...адседзецца да пенсіі…". Так, нашым бібліятэкарам, з кальку-

характэрна для прыватных музеяў: кожны з іх распавядае не толькі ўсеагульную, але і чыюсьці прыватную гісторыю. Па сваёй адукацыі Мікалай Глебавіч далёкі ад музейнай справы. "Вучыла мяне само жыццё", — апісвае ён уласныя ўніверсітэты. І тут жа ўздыхае: "Калекцыянер — гэта бяда для сям'і!".

І сапраўды, калі б Мікалай Панкрат уклаў свае сродкі ды высілкі ў якую больш прыбытковую справу, дык даўно б ужо ездзіў зусім не на пашарпаным "бусіку", што заводзіцца не з першага разу. Толькі арэнда аддадзеных пад музей памяшканняў прыносіла б яму каля тысячы еўра ў месяц!

— Нават на рыбу сёлета выбрацца не атрымалася, — наракае ён, — бо замены ж ніякай няма!..

Затое кожны турыст ведае: ён недарэмна будзе шукаць тую вуліцу Катоўскага. Адпаведна, "народная сцяжына" і не зарастае. Пасля ж перапынку яе давядзецца пратоптваць наноў.

Заўважым, што падобная праблема з завяршэннем будаўніцтва ў нашых мясцінах паўстае ўжо не ўпершыню. Прыкладам, галерэя мастака Кастуся Качана непадалёк ад Навагрудскага замка адкрылася на пару гадоў пазней, чым было запланавана: дакладна з той самай прычыны. На сённяшні дзень для калекцыянера кірунак — пушкініства. Гэтая тэматыка засталася яму ў спадчыну ад маці, якая таксама трохі захаплялася калекцыянаваннем.

Натуральна, у прыватным зборы не знойдзеш тых рарытэтаў, якімі ганарацца вядучыя расійскія музеі, але па некаторых "спецыяльных" намінацыях Мікалай Панкрат нават дасць ім фору. Ён утрапёна збірае прысвечаныя Пушкіну паштоўкі, значкі, цукерачныя абгорткі… І прадстаўнічая дэлегацыя музейшчыкаў з Пушкінскіх гор, якая сёлета наведала "Эпоху Леніна", была прыемна ўражана.

Ля ўвахода ў полацкі прыватны музей "Эпоха Леніна".

Прафесіяналаў-музейшчыкаў у Полацку не бракуе. Мікалай Панкрат з імі не варагуе, але і да канкрэтнай супрацы справа пакуль не даходзіць. Дый не зусім зразумела, на якой юрыдычнай базе такое супрацоўніцтва сёння можа адбывацца.

Падобна, неўзабаве іх усё ж давядзецца выкарыстоўваць у камерцыйных мэтах. Справа ў тым, што колькі гадоў таму калекцыянер пачаў будаваць пад музей новы двухпавярховы дом. Яго сцены ўжо стаяць, а вось даху — няма. Грошы скончыліся, і будоўлю давялося замарозіць. Мікалай Панкрат не бачыць іншага выйсця, як часова закрыць музей, пакуль не ўдасца зарабіць патрэбную для завяршэння будаўніцтва суму.

Як паўплывае на яго дзейнасць такі вымушаны перапынак? Пытанне рытарычнае. Поспех любога падобнага праекта ў значнай меры залежыць ад стабільнасці працы (на жаль, яе бракуе многім іншым прыватным музеям). Менавіта таму Мікалай Панкрат строга прытрымліваецца створанага ім графіка: дзверы для ўсіх адчынены штовыхадныя з 10-й да 18-й.

выйсця з гэтай сітуацыі няма: мясцовыя ўлады нічым не здатныя дапамагчы нават пры наяўнасці такога жадання ды разумення, што кожны падобны аб'ект — чарговы "плюс" на карысць горада.

На працягу нашай гутаркі Мікалай Глебавіч шматкроць паўтараў: "Ды нічога мне не трэба!". І сапраўды, прыватнік адразу разумее, што разлічваць яму выпадае толькі на ўласныя сілы — прынамсі, у матэрыяльным аспекце. Але ж не толькі ён адыгрывае вызначальную ролю ў музейнай справе.

Пакуль што без статуса...

Апрача савецкай эпохі, у экспазіцыі прадстаўлены і іншыя кірункі. Прыкладам, даўняя гісторыя Полацка. Яшчэ адзін прыярытэтны

Неўзабаве завітаў і контр-адмірал расійскага флоту, а заадно і вядомы пушкініст Генадзь Антонаў. Вось што ён напісаў у кнізе водгукаў: "Бачыў шмат, у тым ліку і калекцый "пушкінцаў", але такога не бачыў нідзе і ніколі! Шаноўны Мікалай Глебавіч, ваша ўнікальная калекцыя павінна быць навукова апісана прафесіяналамі".

Прафесіяналаў-музейшчыкаў у Полацку не бракуе. Мікалай Панкрат з імі не варагуе, але і да канкрэтнага супрацоўніцтва справа пакуль не даходзіць. Дый не зусім зразумела, на якой юрыдычнай базе такое супрацоўніцтва сёння можа адбывацца. Можа, менавіта таму мала які прыватны музей Беларусі атрымліваў метадычную дапамогу?

Або іншая праблема: нормы спажывання электраэнергіі для "Эпохі Леніна" вызначаюцца такія самыя, як для любога прыватнага дома. Але які музей без спецыяльнага асвятлення? І паўсотні лямпачак, размешчаных у стэлажах, з'ядаюць у разы больш за выдзеленыя 150 кВт, што цягне дадатковыя выдаткі.

Вырашэнне гэтых дробных і вялікіх праблем прыватнага музея немагчымае без вырашэння самай першай праблемы — нявызначанасці статуса...

Працяг матэрыялу Ілы Свірына пра лёс асобна ўзятага прыватнага музея чытайце на стар. 12.

На маю думку...

Хто мае права **на спектакль?**



Аляксандр ВЕРГУНОЎ,
акцёр

...І, вяртаючыся да набалелай, завязлай у зубах, тэмы аўтарскага права. Хочацца паведаміць, што тэма гэтая расце, шырыцца ды абрыньваецца і на тэатральнага гледача, які нічога не падазрае. Гэта ж як неверагодна проста — я сказаў бы: вытанчана — "выкруцілася" праблема з унутранага ўжывання ў бок глядацкага, усеагульнага.

Прыходзіць, да прыкладу, глядач у тэатр прэм'еру паглядзець. І глядзіць. І, дапусцім, падабаецца яму. Тады радуецца глядач шчыра, дадому прыходзіць, распавядае захліпаючыся. Кажа, што яшчэ сходзіць на гэты спектакль, але ўжо не адзін, а з роднымі, сябрамі, суседзямі. І купляе білеты на ўсіх, затым вядзе ўрачыста іх на прэм'еру. І вось вам сітуацыя: згасае святло ў зале, грае музыка, выходзяць на сцэну акцёры... А спектакль... іншы! Артысты — быццам тыя ж, касцюмы, музыка, словы — падобныя, а — не тое.... І сыходзіць глядач расчараваны, родныя-сябры ўвогуле заракаюцца хадзіць не толькі ў гэты — у любы тэатр. А справа, як высвятляецца, у аўтарскім праве на твор. Давайце разважаць, паклікаўшы логіку.

Нейкая ўстанова, умоўна — "дзяржаўны драматычны тэатр", запрашае рэжысёра, заключае з ім дамову на пастаноўку спектакля ў вызначаныя тэрміны. Афармляе ўсе юрыдычныя фармальнасці, прадастаўляе працоўную прастору — акцёраў, мастакоў, залу, — грошы ды іншае.

І пачынае тварыць рэжысёр. Лепіць шэдэўр, выпакутаваны з п'есы, музыкі, касцюмаў, святла, дэкарацый і, вядома ж, артыстаў. Потым — прэм'ера. Апладысменты. Кветкі. Банкет... Мастацкі савет з захапленнямі і, нарэшце, ганарар... Шлях нараджэння спектакля — ясны і зразумелы, празрысты і чысты: дзяржаўная ж установа прадстаўляе.

Але вось тут і ўзнікае бяда для юнага спектакля разам з галоўным пытаннем: каму ён цяпер належыць? Быццам бы ўсё проста: тэатр замовіў, рэжысёр выканаў працу, тэатр працу прыняў, заплаціў немалыя грошы за яе. Усё. Прадукт належыць тэатру. І правы на спектакль, трэба меркаваць, таксама.

Але на наступны дзень прыходзіць усё той жа рэжысёр — і давай перарабляць гатовы і ўжо прадстаўлены публіцы твор: маўляў, "сябры паглядзелі — ім не спадабалася"... Аднак у пратаколе пасяджэння мастацкага савета сумесна з адміністрацыяй напісана "Прыняць спектакль", а не "Прыняць з дапрацоўкамі". І калі тыя самыя "дапрацоўкі" рэкамендаваны, дык чаму ж гэта не афармляецца дакументальна, не прыходзяць члены мастацкага савета з адміністрацыяй, не прымаюць пад пратакол змяненні?..

Дзе, у якой галіне выпускаюць выраб у свет, а на наступным тыдні пачынаюць перарабляць?! Вы ўяўляеце, якімі былі б у нас машыны, бытавыя прыборы, дамы?.. А ў медыцыне? Мы школьнай праграме, што ўвесь час змяняецца, перасталі ўжо здзіўляцца, дык няўжо да гэтага і ў тэатры гэтак жа хутка прызвычаімся? Гэта ж не штаны! Гэта — спектакль! Яго рыхтавалі месяцы, трацілі не толькі псіхалагічныя ды інтэлектуальныя, але і матэрыяльныя рэсурсы, прычым немалыя... І так лёгка пачынаем разбураць створанае?..

І вось тут узнікае цалкам слушнае пытанне: а пры чым тут глядач? І пры чым дзяржаўныя, падкрэсліваю, дзяржаўныя ўзаемаадносіны: заказчык — выканаўца — спажывец? Ну зразумела, што нельга так рэзка падыходзіць да творчай працы. Але, з іншага боку, дзе тая мяжа дапушчальнасці парушэнняў, змяненняў, правак, дабавак ды іншага?..

Зразумела, спектакль — жывая істота, што расце, рухаецца, змяняецца. Вось тут і патрэбен рэжысёр, які будзе сачыць за тым, каб пастаноўка не выходзіла за рамкі прэм'ерныя. А калі ўжо нешта змяняць, дык вельмі асцярожна, узгадняючы кожны факт з уладальнікам спектакля — тэатрам.

Ведаеце, вельмі хочацца іншым разам вярнуцца ў тое далёкае, не заўсёды дрэннае, савецкае мінулае. Навошта? А каб нагадаць прапісную ісціну: тэатр, сябры, уздзейнічае на самую тонкую субстанцыю чалавека — на яго душу. І тут як ні ў якой іншай галіне чалавечай дзейнасці важны пастулат: не нашкодзь! Чамусьці ў СССР пра гэта памяталі. Сёння ж складваецца ўражанне, што спадары рэжысёры працуюць па прынцыпах "што хачу, тое і кручу", "я так самавыяўляюся, і ваша меркаванне мне...", ну, і далей — па тэксце.

Не, вядома ж, бываюць выпадкі, калі здараецца памылка: быццам бы рэжысёр на выгляд і словы — самавіты, выклікае давер, а на справе — слабы. Памятаеце, як у фільме "Мы з вамі дзесьці сустракаліся"? Вось і цяпер прыкладна тое ж самае адбываецца, прычым — практычна паўсюдна.

Я разумею, што пытанне, узнятае мной, не новае. Думаю, што яно, хутчэй, рытарычнае. Аднак цікавыя ўсё ж былі б думкі дзеячаў тэатра, іншых галін мастацтва, адказных за тэатральную творчасць супрацоўнікаў Міністэрства культуры на гэты конт.

Дарэчы, а ці існуюць наогул для дзяржаўных тэатраў нейкія нормы пастаноўкі спектакля? Напрыклад, часавыя абмежаванні? Бо цяпер рэжысёры лёгка па сем — дзевяць месяцаў ставяць спектаклі (а гэта, нагадваю, яшчэ і матэрыяльныя выдаткі), а потым высвятляецца, што атрымалася "не вельмі", што "сябрам не падабаецца". Карацей, давайце перарабляць...

Ці не крыецца тут пытанне кампетэнтнасці пастаноўшчыка? І не было б гэта так смешна, каб не аказалася гэтак сумна. І зразумела, каб тое быў прыватны тэатр... Хаця якраз у прыватным падобнага не здараецца, бо там дынаміка прыбытку кіруе, там глядач рублём галасуе... А ў дзяржаўным тэатры, аказваецца, можна... Так, мастацтва патрабуе ахвяр, але чаму сёння ахвярамі становяцца гледачы, артысты і... бюджэт? А так хочацца, каб глядач усё ж прывёў сваіх сяброў у Тэатр!..

Чытачы каментуюць у сацыяльных сетках?

лятарам, стэлажамі ды кафедрай, што ўжо рабіць. І мы, бібліятэкары, чакаем, калі ўжо дастануць "катоў з мяхоў", калі пачнуцца змены, але... добрыя змены. Для людзей...

Да артыкула
"У чэраве Траянскага каня"
№ 42

анжэла:
— Слушна сказана: "Складнікаў — усяго два: прага да справы і ахвярнасць ёй. Няма іх — няма нічога, проч фасада". Менавіта гэтага часта і бракуе. Але ваш, Зміцер, прыклад натхняе: узяліся — і робіце. Гэта я пра сядзібу Рэйтанаў. Мая павага!..

Самыя папулярныя матэрыялы газеты "Культура" ў кастрычніку 2013 года (паводле статыстыкі сайта www.kimpress.by):

1. **"Некаторыя прычыны скону тэатра"**, аўтар — Раман Цыркін. (№ 41).
2. **"Аднойчы ўначы..."**, аўтар — Юрый Максіменка. (№ 39).
3. **"Калядныя песні ўлетку?"**, аўтар — Алена Ляшкевіч. (№ 39).
4. **"Тэатр.by: быць ці не быць?"**, аўтар — Алег Чэчанеў. (№ 37).
5. **"Канцэпцыя аднаго маршруту на памежжы"**, аўтары — Ілья Свірын і Дар'я Амяльковіч. (№ 34).
6. **"Тры класікі на адной трасе, або Ад Багдановіча да Адамовіча"**, аўтары — Яўген Рагін і Кастусь Антановіч. (№ 40).
7. **"Спачатку — зінгшпіль..."**, аўтар — Надзея Бунцэвіч. (№ 40).
8. **"Ад Росаў — да Россаў"**, аўтары — Дар'я Амяльковіч, Аляксандр Дзмітрыеў. (№ 41).
9. **"Заўтра не прыйдзе ніколі?"**, аўтар — Сяргей Пукст. (№ 31).
10. **"Маторчык для ўсёй сям'і"**, аўтар — Надзея Бунцэвіч. (№ 39).

Чытайце лепшыя тэксты ў газеце "Культура"!

Што за **табу для журналістаў** вызначыў італьянскі маэстра?

Вядома ж, я амаль адразу закашляўся пасля таго, як вядучая сустрэчы вялікага кампазітара сучаснасці Эніа МАРЫКОНЭ з супрацоўнікам Міністэрства культуры, студэнтамі профільных устаноў і журналістамі, якая прайшла ў мінскім "Прэзідэнт-гатэлі" напярэдадні канцэрта маэстра ў беларускай сталіцы, усіх папярэдзіла, што кашляць пад час прэс-канферэнцыі строга забараняецца. Яшчэ забаранялася, як было напісана ў раздадзеным папярэдне прэс-рэлізе, задаваць пытанні дурныя і "жоўтыя", ужываць у дыялогу з гуру слова "саўндтрэк" і выраз "спагецці-вестэрны". Настукаць па галаве за непаслухмянасць у выніку павінны былі мне і... Марыконэ, бо менавіта ён у самым канцы мерапрыемства ўзгадаў пра вестэрны: маўляў, пісаць музыку да іх перастаў з-за таго, што яму надакучыла прыдумляць нешта, што мала адрозніваецца ад папярэдняга. Увогуле, ад расправы выратаваў мяне сам маэстра, ён жа спадар і сіньёр — так звярталіся прысутныя да героя вечара.

Магутны стары, як выказаліся б, відаць, у такім выпадку Ільф з Пятровым, выглядаў на самой справе магутным, але зусім не старым. А 10 лістапада знакаміты італьянец адзначыць сваё 85-годдзе! Перад прысутнымі паўстаў няхай і не жвавы ў рухах чалавек, затое асоба эмацыйная, жыўчык і гаварун у гутарцы, які распавёў зацікаўленым пра...

...тое, з якімі музычнымі інструментамі асацыюе гарады і краіны

— Калі я прыязджаю з выступленнем у якую-небудзь краіну, у які-небудзь горад, мяне цікавіць толькі адно. Часам арганізатары мне паказваюць мясцовыя славутасці, але ўсё роўна я думаю выключна пра канцэрт, што мае адбыцца. Неяк пісаў музыку для аднаго фільма, дзеянне якога адбывалася ў канкрэтным горадзе, і мне сапраўды захацелася звязаць яго толькі з адным інструментам, ну, ці з двума-трыма. Я доўга-доўга разважаў, што за інструмент гэта мог бы быць, шукаў яго, але так нічога і не прыдумаў, не знайшоў. А "новы" інструмент "стварацъ" не хацелася. Таму Мінск, напэўна, на ваш жаль, я таксама ні з якім інструментам асацыяваць не магу…

Каб да мяне з прапановай напісаць музыку для фільма звярнуўся беларускі кінарэжысёр і мне спадабаўся б сцэнарый, тое, як рэжысёр уяўляе карціну, я абавязкова пагутарыў бы з ім...

...тое, як кінарэжысёры ставяцца да музыкі

— Па тым, як яны ставяцца да музыкі, я падзяляю кінарэжысёраў на тры віды. Першы: якія нічога не разумеюць у ёй, а таму не ведаюць, што павінна гучаць у іх фільме. Гэта вельмі складаны тып рэжысёраў, бо кампазітар можа "адгадаць" тое, што патрэбна заказчыку, а можа доўга нешта сачыняць, прапаноўваць, рэжысёр жа будзе ўсё адхіляць. Другі від: тыя, хто нешта ў музыцы разумее, з якімі можна нешта загадзя абмяркоўваць. Трэці, рэдкі, від: тыя, хто выдатна разбіраецца ў музыцы. Гэты від, у сваю чаргу, я дзялю на два падвіды: тыя, хто хоча нешта канкрэтнае, — такі варыянт мне не вельмі падыходзіць, — і, найбольш блізкае мне, рэжысёры, якія цалкам адкрытыя для дыялога і абсалютна давяраюць кампазітару…

...працу з беларускім кінарэжысёрам

— Калі б да мяне з прапановай напісаць музыку для свайго фільма звярнуўся беларускі кінарэжысёр і мне спадабаўся б сцэнарый, тое, як рэжысёр уяўляе сваю будучую карціну, я спачатку абавязкова пагутарыў бы з ім. А раптам ён сказаў бы, што яму трэба нешта такое, як у Чайкоўскага? Тады я адмовіўся б. Я гатовы ісці на кампрамісы, але — на нязначныя: музыка ў карціне павінна быць мая — аўтарская, — а не навеяная нечымі творамі…

Той яшчэ **Марыконэ**

...працу з расійскім кінарэжысёрам

— Мне спадабалася працаваць з расійскім рэжысёрам Уладзімірам Хаціненкам над фільмам "72 метры". З Уладзімірам і яго сям'ёй у мяне склаліся добрыя адносіны. А вось у карціне Міхаіла Калатозава "Чырвоная палатка" быў зменены невялікі фрагмент у напісанай мною музыцы, хутчэй нават яе тэмпарытм. Я спакойна да гэтага паставіўся і пагадзіўся на такую праўку, таму што яна сапраўды больш дакладна адлюстроўвала драматургію эпізода, тое, што адбывалася на экране.

...куміраў

— З кампазітараў, якія пісалі і пішуць для кіно, на мяне не паўплываў ніхто. З кампазітараў жа ўвогуле на напісанне музыкі мяне найбольш натхняюць Стравінскі і Вердзі…

■■■

Па заканчэнні сустрэчы першы намеснік міністра культуры Уладзімір Карачэўскі дзякаваў Эніа Марыконэ за прадастаўленую магчымасць бачыць яго і гутарыць з ім, і казаў маэстра пра тое, што дарагі ён усім не толькі сваёй музыкай да кіно, але і музыкай наогул — камернай, інструментальнай, напрыклад. Спадар Марыконэ верыў і не верыў, бо свету ён вядомы ў большай ступені як кампазітар, які піша для кіно. А яшчэ Уладзімір Міхайлавіч уручыў Марыконэ статуэтку, што ўвасабляе сабой Музу. Эніа нейкі час у статуэтцы, як мне падалося, выкананай не без уплыву авангарда, Музу не пазнаваў, але потым, відаць, пагадзіўся і з гэтым. А калі яму паабяцалі даць паперу, што на вываз скульптуры мытня без лішніх запытаў дасць "дабро", твар Марыконэ расцвіў усмешкай.

...Я ж так і не паспеў задаць маэстра пытанне "на пасашок": якой, на думку чалавека, што пабачыў і насачыняў усялякага, сёння на свеце музыкі больш: дрэннай, добрай або… злой? А можа, усё ж такі добрай?..

Фота Юрыя ІВАНОВА

Кірчука ў кіно больш не клічуць...

Само сабой, беларускія аўтары таксама заўважаны ў стварэнні музыкі для кіно. І праблемы, і ўдачы, звязаныя з гэтым відам мастацтва ў кампазітараў, пра якія казаў Эніа Марыконэ, знаёмы і ім. Пра сваё жыццё ў кінематографе мы папрасілі распавесці трох добра вядомых аўтараў музыкі розных стыляў.

Беларускія саўндтрэкі: хто гучыць, а хто — не

Алег ЕЛІСЕЕНКАЎ, кампазітар, выканаўца:

— Самае складанае ў напісанні музыкі для кіно — гэта "адгадаць", чаго менавіта хоча рэжысёр ад кампазітара. У мяне бывала такое, што даводзілася хаваць свае амбіцыі ў далёкую скрыню і перапісваць ды перапісваць матэрыял. Прыходзіў да рэжысёра, той слухаў і казаў геніяльны выраз: "Не, гэта не з майго фільма". Я ў яго пытаўся: "А больш канкрэтна можна?". Ён разводзіў рукі, глядзеў у столь, а потым казаў: "Ну, ты зразумеў. Неяк гэтак".

Адна з першых маіх работ у кінематографе — музыка да мультфільма Алены Туравай "Ілюзіён". Год 1990-ы, здаецца. Пісалася тады ўсё ўжывую (без камп'ютараў), з артыстамі аркестра Міхаіла Фінберга. Лена мне распавядала, што нашмат пазней на нейкім фестывалі да яе падышоў знакаміты Яўген Дога і выказаў сваё захапленне саўндтрэкам. Ён здзіўляўся таму, як кампазітар (гэта значыць, я) здолеў аб'яднаць вельмі адрозныя музычныя кавалкі, такія кантрасныя. Пераходы яго ўразілі — з адной тэмы ў іншую.

І яшчэ добра памятаю, як зводзіў у адзінае цэлае музыку для анімацыйнай стужкі "Сны" па Андрэю Платонаву. Таксама пачатак 1990-х. Усё рабілася навобмацак: з аднаго бабульчынага магнітафона браўся фрагмент, з другога — іншы, і яны змешваліся паміж сабою, мікшываліся так, як мне трэба было. У выніку атрымалася музыка, напісаная ў сучаснай акадэмічнай манеры, з выразнымі элементамі авангарда. А ансамбль "Камерата", які браў удзел у праекце, я запісваў, выкарыстоўваючы... секундамер! Камандаваў: "Запіс!", — а праз строга вызначаны час крычаў: "Стоп!"...

Віталь АРТЫСТ, лідар гурта "Без білета":

— У мяне ніколі не было асаблівых складанасцей з рэжысёрамі фільмаў, да якіх мне замаўлялі музыку. Бо, набыўшы вопыт, у дзевяці выпадках з дзесяці я ведаў, што з першага разу яе не прымуць і давядзецца ўсё перарабляць. І мы сядалі з рэжысёрам, ён ставіў на стол усялякія прадметы, выкладваў бульбу, як у "Чапаева", і на пальцах тлумачыў, чаго ён ад мяне хоча.

Халтурыць я сабе не дазваляю, калі бяруся за такую працу, таму сачыняю ды запісваю днямі і начамі. Не так даўно браў удзел у тэндары на напісанне музыкі для адной расійскай стужкі. Прынёс пяць кампазіцый, мне паведамляюць: "Ніводная не падыходзіць". Добра. Потым пераэлефаноўваюць: "Усё падыходзіць, дзякуй!"

З таго, што прыходзіць у галаву адразу, адзначу сваю музыку да такіх стужак, як "Паляванне на Піранню", "Шалёныя сабакі", "Мужчыны не плачуць", "Скрасці Бельмандо". Мне яна... падабаецца. Я з задавальненнем заняўся б саўндтрэкам да якога-небудзь фільма на касмічную тэматыку. У "Салярысе" Таркоўскага — добрая музыка, праўда, саму карціну я пачынаю ўспрымаць з другой яе гадзіны: па кінатэмпе яна, натуральна, несучасная, што мне не блізка. Таксама маю шмат інструментальнай музыкі, але сэнсу выдаваць яе асобна я не бачу. Прыстройваю яе ў кіно...

Іван КІРЧУК, лідар этна-трыа "Троіца":

— Я з задавальненнем успамінаю ўсё тое, што звязана ў нас з кінамузыкай. Пакуль на нашым рахунку тры работы: "Маленькія ўцекачы", "Тры талеры" і "Цень самурая". Мне заўсёды было цікава аб'ядноўваць архаічную этніку з электроннымі інструментамі. Выдатна было: мы закрываліся ў студыі і цэлы дзень "гультаявалі" — займаліся любімай справай. Не падабалася спачатку, што пры мантажы музыку маглі, як нам здавалася, бесцырымонна парэзаць. А потым ўглядаліся ў сюжэт — здаецца, правільна зрабілі, што купіравалі. Шкада, што больш у кіно чамусьці не запрашаюць...

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Алег КЛІМАЎ

Фота Ільі МАЛІНОЎСКАГА і прадастаўленыя артыстамі

Шукае працу генератар ідэй!

А патрабуецца хто?

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1.)

Настасся БАТУРА,
студэнтка IV курса, кіраўнік праекта "ПРАЦАвіТЫ":

— Мы зрабілі праект, каб матываваць студэнтаў да прафесійнага росту. Для таго, каб стварыць праект, часу спатрэбілася — больш за месяц. Былі разасланы прэс-рэлізы 220 кампаніям. Мы вырашылі пачаць праект са студэнтаў, што стануць менеджарамі сферы культуры. Гэта тыя людзі, якія могуць атрымаць працу па рэзюмэ. Мы спыніліся на сталічных кампаніях, найперш таму, што зараз вучэбны працэс у разгары. Зразумела, студэнт дзённай формы навучання не зможа працаваць удалечыні ад Мінска. А вось напрыканцы года мы, магчыма, далучым і арганізацыі з рэгіёнаў, хоць і не ставім за мэту працаўладкаваць усіх студэнтаў. Напярэдадні ў нас праходзіў тыдзень майстар-класаў і трэнінгаў, пад час якіх студэнты знаёміліся з філасофіяй "целеполагания". Інакш кажучы, праект дапаможа акрэсліць мэты…

Дар'я СКАРАХОДКІНА,
студэнтка II курса:

— Папярэдне выбрала пяць кампаній, якія, найперш, займаюцца івэнт-менеджментам, арганізацыяй мерапрыемстваў, канцэртаў. Пакуль у мяне няма вопыту працы, але я ўдзельнічала ў шматлікіх валанцёрскіх праектах сацыяльнай скіраванасці. Так пад час "Белага фестывалю" мы працавалі з дзецьмі, якія маюць абмежаваныя магчымасці, і сіротамі. Таму абраным кампаніям буду прапаноўваць сябе як арганізатар мерапрыемстваў, а таксама — як генератар ідэй.

Зараз маю ідэю зладзіць праект, скіраваны на пашырэнне ведаў школьнікаў пра культуру. Пераканана, калі школьнікам на іх жа мове студэнты будуць расказваць пра культуру і мастацтва, гэта дасць свой пазітыўны эфект. Чаму я вырашыла працаваць з другога курса? А навошта час губляць? Хочацца, каб на чацвёртым курсе я не сутыкнулася з праблемай працаўладкавання і не шукала хаатычна "месца пад сонцам". Таму трэба ўжо цяпер займацца сваім партфоліа.

Прызнаюся, пакуль не гатова працаваць у сельскай мясцовасці. Але чаму б не ладзіць праекты, скіраваныя на вёску, у Мінску? Вось гэтым мне вельмі цікава займацца…

Кацярына БАСІК,
студэнтка III курса:

— Я — вельмі актыўны чалавек. Раней кіравала студсаветам Універсітэта. Потым было валанцёрства, калі я ездзіла ў дзіцячыя дамы, арганізоўвала там дабрачынныя канцэрты, шукала спонсараў для рэалізацыі гэтых праектаў. Арганізоўвала дапамогу студэнтам, што жадалі вывучаць англійскую мову і кітайскую культуру. На трэцім курсе зразумела: я магу атрымліваць грошы за тое, што раблю бясплатна. Сумяшчаю навучанне з працай у Мінскім гарадскім адукацыйным цэнтры "Лідар". Я — педагог-арганізатар, мне цікава кантактаваць з дзецьмі. Заняткі заканчваюцца ў першай палове дня. А другой гадзіне я ўжо на працы, якой занята ўвесь вечар і ўсе выхадныя… На жаль, я — адна з нямногіх, што сумяшчаюць навучанне не столькі з атрыманнем заробку, колькі з фарміраваннем будучых працоўных навыкаў. Аднак пасля заканчэння Універсітэта ў "Лідары" я не застануся. Гэтая праца мне патрэбна, так бы мовіць, для нарошчвання творчых мускулаў. Не выключана магчымасць, што пасля выпуску мяне "зачэпіць" і сельская культура…

Дар'я МАШКО,
студэнтка IV курса:

— Я ўпэўнена, што знайду на гэтым кірмашы вакансій сваю першую працу. Але зайздрошчу першакурснікам, бо яны маюць на гэтыя пошукі больш часу. Дый сумяшчэнне працы з навучаннем дадае маладому чалавеку самастойнасці… Я хацела б займацца канцэртнай дзейнасцю, рэкламай на тэлебачанні. Адна з ідэй, напрыклад, — арганізацыя музычнага маладзёжнага фестывалю дзенебудзь у беларускай глыбінцы з удзелам абсалютна непрасунутых гуртоў. Я нарадзілася ў Маладзечне, а гэты горад, як вы ведаеце, — надзвычай музычны…

Вольга ГУДЗІЛІНА,
студэнтка IV курса:

— Кірмаш вакансій прадастаўляе магчымасць прайсці стажыроўку, бліскучую працоўную практыку. Універсітэт дае нам цудоўныя веды. Я асабіста жадаю паспрабаваць сябе ў адміністраванні. Можа, праект і не дасць мне стабільнай працы, але не пашкодзіць і часовая стажыроўка. Калі "ПРАЦАвіТЫ" займее працяг і калі ў кірмашы вакансій будуць браць удзел кіраўнікі раённай ды абласной культуры, якія здолеюць зацікавіць мяне ўмовамі першага месца працы, я паеду ў рэгіён. А зацікавіць могуць, натуральна, жытло, заробак, перспектыва кар'ернага росту…

А якія патрабаванні прад'яўляюць працадаўцы? Чытайце другую частку матэрыялу!

Аляксандр ДРАГУН,
спецыяліст па кадрах гатэля "Еўропа":

— У першую чаргу мы можам прапанаваць студэнтам працоўныя спецыяльнасці. Гэта вакансіі афіцыянтаў, бармэнаў, прыбіральшчыкаў, а таксама, у перспектыве, адміністратараў. У нас былі такія прыклады, калі колішнія студэнты пачыналі працаваць у гатэлі тымі ж афіцыянтамі, а пасля атрымання дыплома пераводзіліся на пасаду адміністратара. Да слова, 30 працэнтаў нашых супрацоўнікаў — студэнты сталічных ВНУ, у тым ліку Універсітэта культуры…

Зараз плануем арганізаваць некамерцыйны фестываль мастацтваў. Тым больш, маем добры вопыт працы са студэнтамі Універсітэта…

Вольга КРАЎЦОВА,
рэдактар аддзела навін сайта пра адукацыю:

— Шукаем на кірмашы вакансій новых валанцёраў для нашага сайта — актыўных маладых людзей, якія жадаюць займацца праектамі ў галіне адукацыі як у Беларусі, так і за яе межамі, праявіць свае лідарскія здольнасці, рэалізаваць крэатыўныя ідэі. Трэба сказаць, гэтым праектам мы самі займаемся, так бы мовіць, для душы, а таму спадзяёмся, што менавіта наша зацікаўленасць дазволіць знайсці аднадумцаў і сярод студэнтаў…

Алена ВЕЛЯМОВІЧ,
намеснік дырэктара Мінскага гарадскога адукацыйнага цэнтра "Лідар":

— На сённяшнім кірмашы вакансій мы шукаем студэнтаў, якія маглі б працаваць педагогамі-выхавацелямі. Калектыў у нас — малады. Якія кадры нас зацікавяць? Творчыя і камунікатыўныя! Дзеці ў цэнтры — самага рознага ўзросту: ад сямі да сямнаццаці гадоў. І кожны патрабуе індывідуальнага падыходу. Паверце, падрыхтаваць для іх цікавае ды карыснае мерапрыемства — вельмі няпростая рэч. Тым не менш, цэнтр спраўляецца са сваімі абавязкамі. І кожны ахвотны падзарабіць пабольш, можа павялічыць уласную нагрузку, весці заняткі ў большай колькасці секцый. Натуральна, няпроста. Але прысутная тут Каця Басік — спраўляецца, каардынуе творчую працу ўсяго Цэнтра...

Праца ў сферы: дайце перспектыву!

Ад прыбіральшчыка да вэб-майстра

Каміла АЙРЭСТ,
спецыяліст па рабоце з персаналам кампаніі па продажы адзення:

— Мы прыйшлі, каб запрасіць да нас шырокі спектр супрацоўнікаў: ад прадаўцоў да спецыялістаў па рэкламе і маркетынгу. Прад'яўляем патрабаванні, найперш, да асобасных якасцей студэнта: актыўнасці, мэтанакіраванасці... Мы гатовы дадаткова навучаць супрацоўнікаў, павышаць іх кваліфікацыю. У тым ліку пры зацікаўленасці з боку студэнтаў гатовы ўкласці ў іх падрыхтоўку свае сродкі, напрацоўкі, веды…

Кацярына КАРНІЛЕВІЧ,
кіраўнік творчай арганізацыі:

— Мы займаемся, у тым ліку, развіццём музычных некамерцыйных праектаў, падтрымкай айчынных музыкантаў. А таму нам вельмі патрэбны творчыя асобы. Жадаем даць студэнтам магчымасць развівацца, прафесійна расці. Працуючы ў нас, яны змогуць прадметна разабрацца, з якіх частак складваецца арганізацыя святочнага мерапрыемства. Студэнты навучацца падбіраць артыстаў, правільна выкарыстоўваць свае крэатыўныя ідэі.

Вікторыя ВАЛОШЫНА,
дырэктар кампаніі па стварэнні вэб-сайтаў:

— Шукаем будучых крэатыўшчыкаў для сваёй кампаніі. Ведаю, што ў раённых аддзелах, якія займаюцца развіццём рэгіянальнай культуры, — сайты не самыя лепшыя. (А хутчэй за ўсё — іх няма наогул. — **Рэд.**) Між тым, з развіццём турызму, з павелічэннем цікавасці да нашага традыцыйнага мастацтва і архітэктурнай спадчыны такія электронныя крыніцы інфармацыі — вельмі запатрабаваныя ў карыстальнікаў… Мы, да прыкладу, распрацавалі нядаўна сайт для спартыўнага комплексу "Сілічы". Падаецца, чаканні апраўдалі, бо многія кампаніі нас заўважылі. Спадзяёмся, убаку не застанецца і сфера культуры...

Замест заканчэння

Дык якія ж мускулы нарошчваем?

Студэнцкі праект — ухвальны, як ухвальная любая перспектыўная ініцыятыва. А ў тым, што гэтая ініцыятыва "па нарошчванні творчых мускулаў" — перспектыўная, не сумняваемся. Толькі вельмі не хацелася б, каб студэнты БДУКіМ, крэатыўныя і няўрымслівыя, з першага курса пачалі б сумяшчаць навучанне з асваеннем прафесіі, скажам, афіцыянта ці прыбіральшчыка. Такая "стажыроўка", пагадзіцеся, нагадвае хутчэй фізічную падпрацоўку ў жаданні займець грашовы дадатак да стыпендыі. Мускулы можна нарасціць — ды толькі не творчыя.

Усё зразумела: праект "ПРАЦАвіТЫ" пакуль яшчэ набірае разбег. Студэнты толькі спрабуюць вучыцца, як самавызначыцца, як паводзіць сябе з патэнцыйным працадаўцам, як прэзентаваць свае ідэі, амбіцыі, талент, як наладжваць узаемакарыснае супрацоўніцтва. Пажаданне — адзінае: не распыляцца і адточваць менавіта профільныя навыкі. Іх рэалізацыя пры правільным падыходзе прынясе не меншы матэрыяльны даход, чым у бармена і афіцыянта.

Другі нюанс. Студэнцкі праект, як падаецца, павінен сумяшчацца з вытворчай практыкай, у прыватнасці, у рэгіёнах нашай рэспублікі. Так, можна і ў Мінску працаваць на развіццё той жа культуры сяла, забяспечваючы яркімі самабытнымі праектамі клубы ды бібліятэкі раёнаў і абласцей. І хто сказаў, што гэтыя праекты не павінны быць камерцыйнымі? Між тым, гэтая ніша — амаль не занятая. Сярод штодзённай руціны вартыя ўвагі аўтарскія праекты сельскіх работнікаў культуры — ледзь заўважныя. Шкада!

Інакш кажучы, мы вельмі хацелі б, каб "ПРАЦАвіТЫ" ад БДУКіМ стаў сапраўды практыкаарыентаваным, каб студэнт, дасягнуўшы чацвёртага курса, цвёрда ведаў, дзе і якім чынам ён стане прыкладаць свае папраўдзе творчыя сілы. Без гэтага ведання рэгіёны, а тым больш — аддаленыя ад сталіцы, так і застануцца абяздоленымі ў кадравым плане. Хіба пасярод беларускіх палёў і лясоў застанецца праз якое стагоддзе адзін горад — Мінск?..

Матэрыялы паласы падрыхтавалі Яўген РАГІН і Кастусь АНТАНОВІЧ

Стылёвая палітра "ТэАРТ"а год за годам ахоплівае не толькі ўласна драматычныя, але і пластычныя, харэаграфічныя, музычныя спектаклі, а таксама створаныя на мяжы відаў мастацтва. Пластыка даўно ўжо стала неад'емнай часткай ледзь не любога тэатра ўвогуле, сфарміраваўся і асобны кірунак пластычных спектакляў, а сучасныя харэаграфічныя пастаноўкі ўжо некалькі гадоў як сталі на роўных атрымліваць тую ж Расійскую тэатральную прэмію "Залатая Маска". На нашым "ТэАРТ"е такога роду "бязмоўны" (ці амаль бязмоўны) пласт быў прадстаўлены спектаклямі высокага ўзроўню: "Sadeh21" ("Батшава Данс Компані" з Тэль-Авіва), парыжскі "Шэпат сцен" кампаніі "Маленькі гадзіннік" і дзве нашы пастаноўкі — "Рамонт" тэатра "ІнЖэст" і, у дадатковай праграме, студэнцкія "Латэнтныя мужчыны" Яўгена Карняга. Не мела літаратурнай асновы таксама "Доўгае жыццё" Новага рыжскага тэатра. І хаця апошні нельга назваць у поўнай меры пластычным, паспрабуем таксама разгледзець яго з гэтага нечаканага ракурсу.

Несталіца — сталіца — сусвет: вынікі "ТэАРТ"а-2013

"Гаворыць" і паказвае... цішыня

Сцэна са спектакля "Sadeh21".

На мужчын і жанчын разлічыцеся!

"Латэнтныя мужчыны" ўпершыню "выбухнулі" ў чэрвені, калі студэнты нашай Акадэміі мастацтваў заканчвалі трэці курс. Вучэбная пастаноўка? Можа, і так. Але Яўген Карняг, як у той казцы, да чаго ні дакранецца — усё ператвараецца ў адмысловую з'яву. У верасні гэты спектакль узарваў X Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў "Тэатральны куфар": у кулуарах толькі і размоў было, што пра "Латэнтных...". Нарэшце, тыя былі паказаны на "ТэАРТ"е — і ніколькі не згубіліся на фоне такой колькасці сусветна прызнаных пастановак. З адной простай прычыны: спектакль, хаця дзесьці і выходзіць на плакатнасць, а то і рэзкасць, безапеляцыйнасць выказванняў, атрымаўся папраўдзе філасофскім — у ім "вытанцоўваюцца" няпростыя думкі пра жаноцкасць мужчын і "брутальнасць" жанчын. Прычым размова вядзецца "тэт-а-тэт" з гледачом — без падзелу на сцэну і залу, у адным непрыстасаваным пакоі. Яго абшарпаныя сцены, што ніколі не ведалі еўрарамонту, найлепшым чынам выконваюць ролю "сцэнаграфіі" — разам з пісуарамі, развешанымі ледзь не пад столяй як сімвал недасяжнасці.

Туманна-балотны "салярыс"

У "Рамонце" публіку, пераважна маладзёжную, вабіць ужо сам антураж: гледачы — на сцэне, дзеянне — у партэры, амфітэатры, на балконе, у праходах, на крэслах і паміж імі. Аўтар ідэі і рэжысёр Вячаслаў Іназемцаў (ён жа стваральнік, кіраўнік і ўдзельнік "ІнЖэста") надзвычай крэатыўна "абжывае" ўсю прастору і нават паветра глядацкай залы Палаца культуры чыгуначнікаў. Спачатку мы пачуваем сябе быццам у якасці "акцёраў", бо на нас накіраваны пражэктары, а рэдкія "гледачы" ў зале з цікавасцю ўглядаюцца ў нашы твары, быццам гэта не мы, а яны прыйшлі "на нас падзівіцца". У буклетах такое становішча было названа "пярэваратнай сістэмай каардынатаў". Але "фішкай" аказваецца зусім не сітуацыя рамонту, вынесеная ў назву. Гэты пласт спектакля — хіба знешні: крэслы ахінуты лёгкай плёнкай-покрывам, у праходах без асаблівага энтузіязму фланіруюць-працуюць, потым уладкоўваюцца на "перакус" будаўнікі ў спецадзенні і касках. Але ўсё гэта — паралельна з асноўным дзеяннем, што адбываецца пад і над зацягнутымі крэсламі. Накрыўка "дыхае", калышацца, з дапамогай асвятлення ператвараецца ў нейкую "туманную дрыгву", і з гэткага "салярысу" паўстаюць-узнімаюцца цені-прывіды — быццам героі беларускіх паданняў.

А што, хіба не могуць ажываць прывіды ў будынку, дзе ідзе рамонт? Акурат тут ім самае месца! Патурбавалі іх пераробкамі памяшкання, дзе яны знайшлі прыстанішча, — вось яны і павылазілі. Прыблізна так можна выкласці "сюжэт" для аматараў паслядоўнага "жыццёвага" аповеду. Але і гэтая лінія спектакля — знешняя, далёкая ад яго сутнасці.

Узгадаем, што ў 1990-я паводле беларускіх легенд, па лібрэта знаўцы нацыянальнага танцавальнага фальклору Юліі Чурко, у нашым Вялікім тэатры ставіўся балет "Кругаверць". Пры ўсёй адрознасці стылістыкі, той спектакль таксама складаўся з повязі асобных міфалагічна-побытавых мініяцюр. Але быў, пры ўсёй філасофіі, куды больш "рэалістычным", распавядальным, з акцэнтам на меладраматычных дэталях. У "Рамонце" ж, хутчэй, узнікае сінтэз "ажыўленай" містыкі, а бліжэй да фіналу, у сцэне "штурму балкона", і буфанаднай фантасмагорыі — з народнай пластычнай драмай, жанр якой аказваецца асноўным. Пры гэтым кожны эпізод выклікае самыя розныя асацыятыўныя сувязі, разлічаныя на ўспрыняцце любой аўдыторыяй. Але, здаецца, не было ў зале чалавека, для каго той запаволена-містычны "калейдаскоп" раптам не склаўся б у рэальную, а не міфалагізаваную гісторыю беларускага народа.

Форма спектакля, магчыма, магла падацца камусьці крыху "раскіданай", расцягнутай. Ну любіць В.Іназемцаў па некалькі фіналаў — і ў гэтым таксама ягоны "почырк"! Але заварожанасць дзеяй такая, што час пралятае, нібыта ў сне. Арыгінальная і сама ідэя — "выпаўзання" ўсё новых постацей з-пад покрыва, — і пластычныя рашэнні кожнага фрагмента. Фантазія пастаноўшчыка не мае межаў, штораз ён знаходзіць новыя падыходы, не паўтараецца ў сваіх прыёмах, пакідае выканаўцам магчымасць на імправізацыю, але выкарыстоўвае лейтматывы, якія трымаюць канструкцыю і ярчэй высвечваюць ідэі. Таму спектакль можна глядзець не толькі як пластычна запаволены разгорт думкі, але і як таямнічую дзею, як пластыку бясконцых пераўтварэнняў. І не толькі глядзець, але і слухаць! Бо яго ўдзельнікамі становяцца Мацвей Сабураў і гурт "Плато", што надае спектаклю асаблівае жывое дыханне і стэрэаэфекты.

Глядзець спектакль хочацца неаднойчы. Хаця з апошнім пакуль праблематычна: з-за адсутнасці свайго памяшкання, складанасці самой "сцэнаграфіі", інтэрнацыянальнасці праекта (у ім удзельнічае некалькіх акцёраў з Еўропы, што далучыліся ў час майстар-класаў). Таму фестывальны паказ быў усяго другім па ліку, хаця прэм'ерны адбыўся ажно некалькі месяцаў таму. Урэшце, пра сітуацыю гэтую "К" пісала ў № 20 за 2013 г.

Сцэна са спектакля "Шэпат сцен".

Сцэна са спектакля "Рамонт".

Сцэна са спектакля "Доўгае жыццё".

Не цыкайце на цырк!

Здані, мроі і містыка шчодра "насялялі" і "Шэпат сцен", які можна назваць аўтарскім спектаклем Вікторыі Т'ерэ-Чаплін — дачкі сусветна вядомага артыста і рэжысёра. Здавалася б, тая ж зыходная сітуацыя: у доме — рамонт, пераезд, гераіня "сядзіць на чамаданах" (дакладней, на картонных каробках), а потым збягае. Толькі хіба можна збегці ад сябе? Ніякай эпікі, уласцівай "Рамонту", — адно псіхалагічныя ваганні. Але ж наколькі французскім, па-жаночаму вытанчаным, грацыёзным аказаўся гэты аповед на мяжы тэатра і цырка! Ад апошняга — ніякай клаўнады, дэманстрацыі фізічна-спартыўных магчымасцей. Толькі тэатральныя пераўтварэнні назваць фокусам, трукам — нельга аніяк: гэта штосьці накшталт чараўніцтва, прызначанага не здзівіць, а раскрыць тонкую, чуйную да ўнутранага голасу, псіхалогію гераіні, здольную бачыць і чуць тое, што недаступна іншым.

Ізраільскі спектакль "Sadeh21" таксама стаў чараўніцтвам, толькі іншага кшталту. Сола, дуэты, разнаколькасныя ансамблі — своеасаблівая магія лічбаў, рухаў, скульптурнага спляцення целаў. Ён заварожваў самой эстэтыкай руху — і зафіксаванай позы, харэаграфічнай поліфаніяй — і паслядоўным чаргаваннем асобных сцэн-мініяцюр.

Два пакаленні — адзін "твар"

Поліфаніяй "вечнага руху" ў запаволеным рапідзе ўспрымалася "Доўгае жыццё". Змест спектакля — адзін дзень з жыцця пяці старых. У двух пакойчыках — сямейныя пары, у трэцім — адзінокі стары. Агульная кухня, сумесны санвузел. Назіраць можна за кім заўгодна ці за ўсімі адначасова. Што гэта — своеасаблівае "рэаліці-шоу", як было пазначана ў фестывальным буклеце? Можа, і так. Нам паказваюць тое, як стары намагаецца ўладкавацца на ўнітазе, як на рэальнай патэльні рэальна падгарае смажаная рыба, і мы гэтак жа рэальна адчуваем гэты смурод. Але праз час становіцца зразумела, што ўсё гэта — ізноў-такі, знешні слой відовішча. Бо спектакль — не "побытавая хроніка". Гэта шчымлівы і адначасова надзвычай аптымістычны, скрозь усю трагедыю, гімн жыццю, руху, творчасці. Здавалася б, кожнае простае дзеянне для насельнікаў гэтай ці то камунальнай кватэры, ці то дома састарэлых — невыканальная задача. Ім цяжка самастойна апрануцца, зрабіць літаральна некалькі крокаў, не кажучы ўжо пра больш складаныя рэчы. Але старыя — кранальныя і смешныя адначасова — жывуць тым, што ім увесь час штосьці патрэбна. Не толькі для элементарнага існавання на ўзроўні "паспаць ды пад'есці", але і для... самавыяўлення ды творчасці. Яны займаюцца "спартыўнай падрыхтоўкай", прыстасаваўшы пластыкавыя бутэлькі на вяровачцы ў якасці эспандэра. Вынаходзяць самаробныя электрамузычныя інструменты, эксперыментуюць з гукам. Шыюць — няхай і пахавальнае адзенне адно для аднаго, вяжуць. Малююць, выпальваюць па дрэве. З дапамогай прэзерватываў, выкарыстоўваючы іх як "форму для заліўкі", вырабляюць адмысловыя сувеніры. І тое, як адзін стары ўвесь час караскаецца па мэблі ўгару, каб павесіць карціну, становіцца сімвалам імкнення да вяршыняў. Сімвалічна і тое, што іграюць старых — маладыя артысты, прычым без грыму, ствараючы вобраз адно праз "старэчую" пластыку.

Рэакцыя залы была рознай. Людзі сталага веку ўпотай змахвалі слязу. Моладзь — рагатала, нібыта глядзела "Маскі-шоу". Раптам падумалася: а ці ёсць у некаторых юных гледачоў, сярод якіх былі пераважна студэнты профільных устаноў, валанцёры ды іншыя невыпадковыя ў мастацтве людзі, той жа "зарад творчасці"? Няўжо такое бескарыслівае імкненне да вяршыняў, не звязанае з адпаведнай грашовай узнагародай, — такі ж "рарытэт мінулага", як гэтыя старыя?..

Адказ на гэтае пытанне — у адным з наступных нумароў "К".

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА і з архіва форуму



Т. і Ю. Рудэнкі. "Горад Шагала".

З 12 лістапада ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі — выстаўка "Толькі вечныя каштоўнасці" ад віцебскіх мастакоў Таццяны і Юрыя Рудэнкаў, прымеркаваная да 60-годдзя абаіх майстроў. У экспазіцыі будзе прадстаўлена каля ста работ: габелены, батык, дэкаратыўныя пано, дробная пластыка і жывапіс.

Мастыхін

Шагал са смарагдамі

Юрый Васільевіч і Таццяна Аляксееўна атрымалі адукацыю на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педагагічнага інстытута. Гэта ўнікальны творчы тандэм: усё робяць у сааўтарстве. Намаганні ў стварэнні твораў размяркоўваюцца прапарцыянальна ў залежнасці ад ступені складанасці задачы, а таму і ўвасабляюцца ў мастацкія, адзначаныя пячаткай своеасаблівасці іх асоб.

Запамінаюцца па вобразным і дэкаратыўным рашэнні габелены "Медытацыя" і "Горад Шагала". Перад мастакамі стаяла нялёгкая задача ўстанаўлення шматпланавых візуальных сувязей пры захаванні агульнай плоскасці кампазіцыі. Ім абаім уласціва смелая манера кампанаваць дзякуючы асіметрыі і свабоднаму ахопу вялікага палатна. З гэтых адносна невялікіх тканых пано нарадзіліся вялікія заслоны для інтэр'ераў Дзяржаўнага музычнага каледжа імя І.І. Салярцінскага, Раённага дома культуры Віцебска, Цэнтра культуры "Віцебск", канцэртнай залы завода "Эвістар", Дома культуры Верхнядзвінска.

Арыгінальнасць вобразнага бачання выяўляецца ў стварэнні гарачых батыкаў, дзе ўдала спалучаюцца роспіс натуральнымі фарбавальнікамі ды вышыўка кітайскім шоўкам. Тут ідзе пошук новых колеравых гармоній, і ў сілу ўступаюць спецыфічныя законы кожнага віду дэкаратыўнага мастацтва.

Акрамя габелена і батыку Рудэнкі захапляюцца арыгінальнымі пано-аплікацыямі, выкананымі ў змяшанай тэхніцы. У дэкаратыўных работах, якія адлюстроўваюць вобразы любімага мастакамі свету прыроды, асабліва — птушынага царства, выяўляюцца рамантычныя памкненні творцаў.

Майстры звяртаюцца да ювелірнага мастацтва, дробнай пластыкі. Багатыя, мудрагелістыя формы, брутальнасць, супастаўленне масіўных частак і дробных ажурных дэталей характэрны для іхніх работ "Эпоха Вадалея" і "Нараджэнне воблака".

Як мастакі-ювеліры яны звяртаюцца і да белага серабра ды жоўтага золата, спалучаючы іх у асноўным з гранёнымі камянямі: смарагдамі, рубінамі, цыркона-мі... Метал выступае ў якасці матэрыялу, які валодае ўласнымі выразнымі момантамі.

Марына МАЛЬГІНА, мастацтвазнаўца

Т. і Ю. Рудэнкі. Ювелірная кампазіцыя.

Вернісаж

У гродзенскай арт-галерэі "Крыга" — выстаўка Андрэя Філіповіча "Горад святога Губерта", якая ладзіцца з нагоды Дзён святога Губерта ў абласным цэнтры.

Фестываль

Фільм вядомага беларускага рэжысёра Надзеі Гаркуновай "Signora Russa" пра паспяховага прадпрымальніка ў свеце моды Мілу Ануфрыеву пакрысе пачынае свой фестывальны разбег. Так, на амерыканскім форуме "SkyFest", што ладзіцца ў штаце Паўночная Караліна, ён быў названы адным з лепшых у дакументальнай праграме.

Камертон

Здымайце камерны на камеру!

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 2.)

Сярод струнных квартэтаў перамог калектыў з Новасібірскага музычнага каледжа, які абышоў не толькі студэнтаў кансерваторый, але і выкладчыкаў з Казахстана. Ён паўстаў як адзіны арганізм, прадставіў найскладаную праграму, вартую прафесіяналаў найвышэйшага ўзроўню. А ўсё таму, што квартэтны клас у тым музычным каледжы — абавязковы, і выкладае яго сам дырэктар. У Беларусі былі ў свой час такія выбітныя струнныя квартэты, як "Аўра" на чале з Леапольдам Ауэрам (адсюль і назва калектыву), струнны квартэт Беларускага саюза кампазітараў. Дый зараз у штаце філармоніі — цудоўны Струнны квартэт. Але вось парадокс: прафесійны калектыў, студэнцкія ансамблі ў нас — існуюць, а сама культура ансамблевага музіцыравання сфарміравана далёка не ў той ступені, як мае быць. Каб зразумець гэта, не абавязкова параўноўваць нас з Захадам. Дастаткова ўзгадаць XVIII — пачатак XIX стагоддзяў, калі ансамблевае музіцыраванне было неад'емнай часткай побыту любога беларускага шляхціча, не кажучы ўжо пра магнатаў. Дый той жа Міхал Клеафас Агінскі, імя якога носіць фестываль, ніколі не лічыў сябе музыкантам-прафесіяналам, але ж ансамблістам быў выдатным. Пра гэта яшчэ раз нагадаў канцэрт адкрыцця конкурсу, праведзены Ансамблем салістаў "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава, са змястоўным уступным словам знанага музыканта і даследчыка, кіраўніка "Беларускай капэлы" Віктара Скорабагатава. Мясцовымі ўладамі робіцца шмат для аднаўлення сядзібы Агінскага ў Залессі — з цягам часу конкурс будзе праходзіць там і, спадзяюся, ператворыцца ў грандыёзную падзею сусветнага маштабу.

— Аднаўленне сядзібы, — пацвярджае выканаўчы дырэктар конкурсу, начальнік аддзела ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Смаргонскага райвыканкама Таццяна РАЖАВА, — адно з найбольш актуальных для нас пытанняў. Сваімі сіламі зрабіць гэта немагчыма. Аб'ект унесены ў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму, работы вядуцца пераважна за кошт рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. У 2015-м будзе святкавацца 250 гадоў з дня нараджэння Агінскага, і хочацца адзначыць юбілей як мага лепш: не проста конкурсам, а цэлым фестывалем. Менавіта ў Залессі! У адрэстаўраваную канцэртную залу мы купім добры раяль — і тая стане яшчэ адным культурным цэнтрам не толькі рэгіёна, але і ўсёй краіны…

— Смаргонская грамадскасць, — працягвае член журы конкурсу, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Ларыса ДЗЯДУК, — марыць, каб конкурс ператварыўся ў фестываль, як гэта, дарэчы, калісьці і было. Але для гэтага патрабуецца вялікая папярэдняя праца ў рэгіёнах, у тым ліку — з нашага боку. Трэба правесці адборы ў асобных гарадах, каб назбіраць 30 — 40 добрых дзіцячых камерных ансамбляў. Але ж трэба яшчэ і забяспечыць іх адпаведным рэпертуарам! Яго, вядома, не хапае. Таму добра было б замовіць такія творы нашым кампазітарам, у тым ліку маладым, нават студэнтам. Бо павінны быць творы для розных складаў — з удзелам духавых інструментаў, струнных, ударных. Зацікаўленасць у фестывалі, а не толькі ў конкурсе, выказвалі і члены журы з Расіі, Літвы — тых краін, унёсак у культуру якіх Агінскі зрабіў таксама...

Смаргонскія ўлады ўжо і зараз шмат робяць для папулярызацыі ягонай асобы і творчасці. Імя Агінскага носіць мясцовая школа мастацтваў, дзе і праходзілі конкурсныя праслухоўванні.

Што ж да вынікаў спаборніцтва, дык беларускія ўдзельнікі, нягледзячы на блізкасць па тэрмінах конкурсу Ельскага, да якога некаторыя рыхтаваліся паралельна, зарэкамендавалі сябе вельмі і вельмі добра. Але ў намінацыі камерных ансамбляў з удзелам фартэпіяна абсалютна справядліва лідзіраваў фартэпіянны квартэт Акадэміі музыкі імя Станіслава Манюшкі з Гданьска. Гэты польскі калектыў — пераможца многіх найпрэстыжных конкурсаў. Але справа яшчэ і ў тым, што ў гэтай навучальнай установе такімі змяшанымі па складзе ансамблямі кіруюць педагогі адразу некалькіх спецыяльнасцей. Вядзе ансамблевы клас — піяніст, але ў яго ёсць асістэнт — педагог-струннік, які, адпаведна, займаецца са струннікамі, што ўваходзяць у калектыў, выключна іх прафесійнымі праблемамі. Такую практыку было б няблага ўкараніць і ў нас, бо вынікі яна дае — выдатныя. Акрамя ўсяго, узнімаецца прэстыж камернага класа, а гэта, зразумела, станоўча ўплывае на агульную цікавасць да ансамблевага музіцыравання ў грамадстве…

Надзея БУНЦЭВІЧ

На здымку: пад час конкурснай праграмы.

Дык якія вы, бібліятэка будучыні і "нелегкадумны" прафесіянал?

"Калі ж вы нас

Як і анансавалася, нядаўні Міжнародны кангрэс "Бібліятэка як феномен культуры" прапанаваў удзельнікам не толькі дасягненні ў бібліятэчнай справе, у тым ліку — найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі, але і маштабны дыскурс "Беларуская бібліятэка будучыні". Ініцыятарам і мадэратарам яго стала намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па абслугоўванні карыстальнікаў і ідэалогіі Алена Далгаполава.

Для мерапрыемства ў НББ быў абраны нестандартны фармат. У прагнозна-аналітычную групу ўвайшлі чатыры бібліятэчныя работнікі з працоўным стажам не больш за пяць гадоў. (Вырашана было прыслухацца да маладых крэатыўшчыкаў, для якіх прафесійны абавязак яшчэ не стаў руцінным.) Пасля прэзентацыі кожнага з індывідуальных праектаў апошнія ацэньвалі як афіцыйныя, так і незалежныя эксперты.

Носьбіты свежых думак

Менавіта так Алена Далгаполава назвала ўдзельнікаў прагнозна-аналітычнай групы. Імі сталі Аляксандра Ашкенадзэ — вядучы бібліятэкар аддзела маркетынгу Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі Мінска; Ала Васільчанка — бібліятэкар Брэсцкай абласной бібліятэкі; Антон Строіч — бібліятэкар другой катэгорыі аддзела фарміравання электронных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі; Марыя Грынько — бібліятэкар першай катэгорыі аддзела абслугоўвання фундаментальнай бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Самы вялікі працоўны стаж мае Ала Васільчанка, якая скончыла ВНУ ў 2008 годзе. Самы малады — Антон Строіч, прыступіў да працы толькі летась… Кожны з крэатыўшчыкаў, падкрэсліла Алена Далгаполава, прадстаўляе індывідуальныя праекты, у якіх пазначаны тры ўмовы, што забяспечаць іхнім установам устойлівае развіццё.

Аўтарытэтнасць афіцыйнага экспертнага журы не выклікала сумневаў хаця б з той прычыны, што ў яго ўвайшла дырэктар Барысаўскай цэнтральнай бібліятэкі Галіна Слесарэнка. Гэтая ўстанова, бясспрэчна, — адна з інавацыйных не толькі на Міншчыне. У абмеркаванні бібліятэчных праблем удзел узялі ў якасці чытачоў прафесійныя юрыст і рэкламшчык. Функцыю незалежных экспертаў мог выканаць любы ахвотны з залы, дзе сабраліся лепшыя прадстаўнікі беларускай бібліятэчнай прафесіі.

Чытацкая мафія

Сёння адзін з самых вялікіх клопатаў для ўстаноў культуры — прыцягненне сямейнага наведвальніка, а ў адносінах да бібліятэк — найперш, чытача. І не паасобку, а — разам. Пагадзіцеся, у нашым мітуслівым быцці сям'я ўсё ж павінна знаходзіць час, каб не толькі збірацца разам за абедзенным сталом па выхадных, але і ў поўным складзе завітваць у тыя ж музей, тэатр, бібліятэку. У гэтым перакананы і ў Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы беларускай сталіцы. У прыватнасці, праект нефармальнай адукацыі "Лесвіца" Аляксандры Ашкенадзэ, які, дарэчы, і перамог у конкурсе, арыентаваны на неабмежаваны асветніцкі патэнцыял бібліятэк.

На думку Аляксандры, сёння практычна кожная айчынная бібліятэка, і не толькі дзіцячая, можа праводзіць дні сямейнага чытання, да прыкладу, хаця б у адну з субот месяца. Цягам гэтага дня мусяць адбывацца забаўляльныя ды асветніцкія мерапрыемствы для дзяцей і дарослых. У выніку бацькі пачалі не толькі прыводзіць сваіх дзяцей у бібліятэку, але і самі пажадалі ўдзельнічаць у цікавых імпрэзах.

Яшчэ адзін пункт праекта Аляксандры — школа татаў, а калі больш дакладна — сямейны цэнтр "Тата можа". Для бацькаў прапаноўваецца поўны спіс твораў той або іншай тэматыкі (да прыкладу, пытанні бацькоўства) на блогу бібліятэкі. Ізноў-такі, прапаноўваюцца як звычайныя тэксты, так і ў сучасным фармаце — для электронных кніг.

Не менш запатрабаванай, па словах Аляксандры Ашкенадзэ, стала праграма "Шчаслівае дзяцінства". Гэта пляцоўка для бацькоў, якія разам з бібліятэкарамі могуць абмяркоўваць актуальныя праблемы выхавання.

Чарговы кірунак праекта "Лесвіца" — "RU-OFF". Гэта — клуб размоўнай англійскай мовы для падлеткаў. Лепшаму засваенню новай інфармацыі, пераканана Аляксандра Ашкенадзэ, дапамагае разняволеная атмасфера, у тым ліку з-за адсутнасці дзённікаў ды адзнак. Не менш запатрабаваны і курсы нямецкай мовы для пяці- — шасцігадовых дзяцей, якія праводзяцца сумесна з Інстытутам Гётэ ў Мінску. На такіх бібліятэчных занятках гучаць вершы ды песенькі, адбываюцца гульні з элементамі нямецкай мовы, яе лексікай.

зана анічога. А ўжо і па яе вывучэнні з'явіліся ў Мінску прыватныя курсы. Тым не менш, надзвычай важным падаецца кірунак праекта "Бібліятэкі ідуць!". Чаму б да такіх адукацыйных мерапрыемстваў не далучаць тых жа сельскіх бібліятэкараў?

Брэсцкі акцэнт

Маюць што прапанаваць сваім калегам і брэсцкія бібліятэкары. Што і казаць, тэма выступлення Алы Васільчанка надзвычай амбіцыйная — "Беларуская бібліятэка будучыні". Дык якімі ж мусяць быць гэтыя ўстановы культуры ў перспектыве? На думку спецыяліста, існуюць тры ўмовы, якія дапамогуць бібліятэцы захаваць сваю ролю ў

Неабходнай для працы бібліятэк умовай з'яўляецца ІТ-стратэгія развіцця. Але, ізноў жа, наколькі яна стасуецца з магчымасцямі сельскіх ці раённых бібліятэк? Пытанне рытарычнае.

Курсамі замежнай мовы нікога ўжо не здзівіш, што нельга сказаць пра "Літаратурную мафію-клуб". Бібліятэкары праз гульнявую форму прываблiваюць дзяцей да чытання прыгодніцкіх кніг, у прыватнасці, на літаратурнай аснове робяць разнастайныя квесты. У выніку падлетак можа адчуць сябе дэтэктывам ці нават тайным агентам, разгадваць пакручастыя загадкі, адлюстраваныя ў мастацкай літаратуры.

А вось наступны кірунак "Лесвіцы" — "Бібліятэкі ідуць!" разлічаны ўжо не на чытачоў, а непасрэдна на саміх бібліятэчных супрацоўнікаў і мае на мэце павышэнне іх кваліфікацыі праз разнастайныя семінары, вебінары, лекцыі ды конкурсы. Адзін з такіх прыкладаў удасканалення — "Школа крэатыўнага лідарства для бібліятэкараў". За восем дзвюхгадзінных заняткаў адбываецца самааналіз уласнага патэнцыялу ды лідарскіх здольнасцей.

Відавочна, усе прапановы Аляксандры досыць цікавыя, але ці рэалістычныя? Адна справа — праводзіць дні сямейнага чытання ў сталіцы, і зусім іншая — у аграгарадку, дзе дзяцей можна па пальцах пералічыць. Пытанні выклікае і праграма "RU-OFF", у рамках якой дзецьмі вывучаюцца англійская і нямецкая мовы. На жаль, пра родную беларускую ў праекце не было ска-

інфармацыйнай і сацыякультурнай інфраструктуры грамадства. Гэта, найперш, **фарміраванне фонду дакументальных крыніц з прыярытэтам на збор унікальных матэрыялаў і калекцый**. Ала Васільчанка мае на ўвазе, у першую чаргу, зборы ў дапамогу навукоўцам і студэнтам, а ў якасці прыкладу прыводзіць фарміраванне фондаў беларуска-польска-ўкраінскага цэнтра. Акрамя таго, на думку бібліятэкаркі, сёння надзвычай важна працаваць з электроннымі калекцыямі, у тым ліку прысвечанымі мясцоваму краязнаўству. Дзяўчына пераканана: перспектыва бібліятэк — за цэнтрамі школьнага і музейнага краязнаўства. Пацвярджэннем таму з'яўляецца сайт "Краязнаўства Берасцейшчыны", працу над якім вядзе абласная бібліятэка.

Другой умовай захавання бібліятэкамі статуса-кво, па словах Алы Васільчанка, з'яўляецца **аптымізацыя працэсу абслугоўвання карыстальнікаў.** Пад гэтым бачыцца стварэнне чытальнай залы адкрытага тыпу, змена фізічнай прасторы бібліятэкі, скіраванай на пашырэнне сацыякультурнай функцыі ўстановы. Умоўна кажучы, важна, каб у бібліятэцы месца было не толькі для стэлажоў з кнігамі, але і для магчымасці пакаштаваць кавы. Чаму ж не, калі бібліятэка, на думку Алы,

Аўтары праектаў бібліятэк будучыні

Ала Васільчанка.

Марыя Грынько.

Антон Строіч.

Аляксандра Ашкенадзэ.

На людным месцы

Мараль — на кніжнай паліцы

У Ашмянскай гарадской бібліятэцы № 1 цудоўна разумеюць, што духоўнасць нельга аддзяліць ад маралі, а мараль, у сваю чаргу, наўпрост звязана з рэлігіяй. Каб быць на ўзроўні патрабаванняў часу, калектыву ўстановы давялося пераасэнсаваць змест сваёй дзейнасці. Вызначылі чытачоў, якім патрэбна інфармацыя маральнага характару, сфарміравалі адпаведны кніжны фонд. Дарэчы, фонд дакументаў гарадской бібліятэкі па дадзенай тэматыцы доўгі час асабліва не абнаўляўся.

Дапамаглі арганізатары праваслаўных кірмашоў. Наш фонд уключае цяпер як уласна кніжныя выданні, так і электронныя. Яны прадстаўлены на пастаяннай выстаўцы "Дарога да храма". Няма сумневаў, што распачынаць яе трэба з дзяцінства. Таму работа з маленькімі чытачамі вядзецца як у сценах бібліятэкі, так і праз пазастацыянарнае абслугоўванне ў дзіцячым садку № 1. Былі праведзены гадзіна цікавай размовы "Дзіцячая Біблія", урок духоўнасці "Душа і малітва", выстаўка-прэзентацыя "Міласэрнасць на кніжнай паліцы". Пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў выкарыстоўваліся выданні выдавецтва Беларускага Экзархату. Бібліятэка аформіла падпіску на перыёдыку духоўнага зместу.

Работа з духоўнай літаратурай вядзецца максімальна карэктна. Даючы карыстальнікам бібліятэкі інфармацыю аб ацэнцы Праваслаўнай Царквой, да прыкладу, абстрактнага мастацтва, нельга пры гэтым дэманстраваць толькі адзін варыянт і падаваць яго як адзіны. Трэба заўсёды пакідаць за чытачом права выбару.

Людміла ЗАРЭЦКАЯ,
загадчык Ашмянскай гарадской бібліятэкі № 1

Што сэрца памятае?

Трыццаць гадоў таму ветэраны Вялікай Айчыннай вайны прапанавалі работнікам тагачаснага аддзела культуры Бярозаўскага райвыканкама стварыць хор і назваць яго "Памяць сэрца".

Першыя ўдзельнікі клуба "Памяць сэрца" (у цэнтры, злева направа) Марыя Пазняк, Мікалай Пятніцкіх і Іван Панюціч пасля выступлення цяперашняга складу калектыву.

ёсць так званае трэцяе месца — нейтральная пляцоўка для сацыяльнага ўзаемадзеяння. Ала Васільчанка дала і вызначэнне бібліятэкара будучыні. На яе думку, гэта чалавек, які ўмее знаходзіць, апрацоўваць, захоўваць і прапаноўваць у карыстанне ў патрэбны час у патрэбным месцы інфармацыю.

І, нарэшце, трэцяй неабходнай для працы бібліятэк умовай з'яўляецца **ІТ-стратэгія развіцця**. Гэта і алічбоўка фондаў, і стварэнне баз даных, карпаратыўных ІТ-прадуктаў, мабільных дадаткаў.

Сапраўды, усе адзначаныя ўмовы вельмі важныя для функцыянавання сучасных бібліятэк, але, ізноў жа, наколькі яны стасуюцца з емствамі. Маюцца на ўвазе тэатралізацыі, дыскусійныя пляцоўкі, выкарыстанне аўдыя- і відэаматэрыялаў. Перспектыва — за супрацоўніцтвам з тэматычнымі сайтамі ды форумамі. Кароткі тэматычны пост са спасылкамі на дзве-тры крыніцы стане для наведвальнікаў больш цікавым за спіс рэкамендаванай літаратуры. Мае перспектыву і пераарыентацыя з уласных сайтаў, блогаў на іншыя інтэрнэт-парталы ды электронныя СМІ. А для таго, каб павялічыць колькасць чытачоў, варта пастаянна працаваць з патэнцыйнымі карыстальнікамі, ведаць, што ім не падабаецца ў развіцці бібліятэчнай справы. У адпаведнасці з гэтым карэктуецца і рэкламная палітыка ўстановы…

Пытанні выклікае і праграма, у рамках якой дзецьмі вывучаюцца англійская і нямецкая мовы. На жаль, пра родную беларускую ў праекце не было сказана анічога. А ўжо і па яе вывучэнні з'явіліся ў Мінску прыватныя курсы...

І папярэднія выступоўцы казалі ў асноўным пра гэтыя кампаненты. Але не будзем прыдзірацца… Хоць выснова пра тое, што ўніверсітэцкая бібліятэка будзе жыць да той пары, пакуль існуе студэнцтва, падалася прасталінейнай. Пры падобным раскладзе будучыня такой установы — гарантаваная. Толькі і паспявай, што інфармацыйныя рэсурсы абнаўляй ды ўдасканальвай…

Шчыра кажучы, мы тым днём беларускую бібліятэку будучыні так і не пабачылі ва ўсёй яе бліскучай шматграннасці ды прывабнасці для чытачоў, якія сёлета толькі пайшлі ў першы клас. Не дадалі яркіх фарбаў у фантастычную пакуль карціну і больш сталыя бібліятэчныя работнікі…

маркетынгу навучыце?"

магчымасцямі сельскіх ці нават раённых бібліятэк? Пытанне рытарычнае. З іншага боку, магчыма, спрацуе правіла, калі, бачачы паспяховы прыклад калег, да іх узроўню будуць падцягвацца і слабейшыя. Што ж, пажывём-пабачым.

Шматфункцыянальная — загана?

Самы малады крэатыўшчык Антон Строіч сваё выступленне пачаў цытаваннем аднаго з амерыканскіх бібліятэказнаўцаў: "Бібліятэка павінна пакінуць усякую надзею стаць шматмэтавым прадпрыемствам". Тэза на сёння — вельмі спрэчная, але больш падрабязна пра гэта — крыху пазней.

Антон ўпэўнена выклаў свае тры тэзісы. Ён прамаўляў пра тое, што стварэнне электроннай калекцыі дакументаў дазволіць установе канкурыраваць з інфармацыйнымі інтэрнэт-рэсурсамі. Фармат такога дакумента павінен быць максімальна зручным для карыстальніка. Пошукавая сістэма ў бібліятэцы будучага павінна будавацца па ўзоры інтэрнэтаўскіх сістэм. Доступ да інфармацыйных рэсурсаў дадзенай установы павінен быць аддаленым: па адзіным чытацкім білеце для ўсіх бібліятэк Беларусі.

Належны акцэнт быў зроблены і на павышэнні інфармацыйнай культуры карыстальніка. Асаблівасць працэсу — неперарыўнасць і сістэмнасць. Он-лайн-навучанне — адна з форм павышэння гэтай культуры.

Бібліятэка, перакананы Антон, павінна пастаянна прыцягваць да сябе чытачоў. Прыярытэт тут — за сацыяльна-культурнымі мерапрыемствамі. Маюцца на ўвазе тэатралізацыі, дыскусійныя пляцоўкі, выкарыстанне аўдыя- і відэаматэрыялаў. Перспектыва — за супрацоўніцтвам з тэматычнымі сайтамі ды форумамі. Кароткі тэматычны пост са спасылкамі на дзве-тры крыніцы стане для наведвальнікаў больш цікавым за спіс рэкамендаванай літаратуры. Мае перспектыву і пераарыентацыя з уласных сайтаў, блогаў на іншыя інтэрнэт-парталы ды электронныя СМІ. А для таго, каб павялічыць колькасць чытачоў, варта пастаянна працаваць з патэнцыйнымі карыстальнікамі, ведаць, што ім не падабаецца ў развіцці бібліятэчнай справы. У адпаведнасці з гэтым карэктуецца і рэкламная палітыка ўстановы…

Праблема, неаднаразова агучаная "К": нашы бібліятэкары не жадаюць (а дакладней — не умеюць) сябе піярыць, бо, па іх перакананні, такая нясціплая "легкадумнасць" прафесійнаму кніжніку не да твару. Але гэта — абавязковая частка бібліятэчнага маркетынгу.

Галіна Слесарэнка запэўніла прысутных, што тэзісы Антона ёй спадабаліся. Але сама падача прэзентацыі выглядала не надта аптымістычна. Нельга не пагадзіцца. Праблема, неаднаразова агучаная "К": нашы бібліятэкары не жадаюць (а дакладней — не ўмеюць) сябе піярыць, бо, па іх перакананні, такая нясціплая "легкадумнасць" прафесійнаму сур'ёзнаму кніжніку — проста не да твару. Але ўсё гэта — абавязковая частка бібліятэчнага маркетынгу. І без пэўнага аптымістычнага артыстызму тут проста не абысціся. Інакш занадта змрочна-тэхналагічнай выглядае будучыня. Проста нейкая "вайна машын" за чытача! І наконт шматфункцыянальнасці. У выніку аптымізацыі на сяле з'яўляецца ўсё больш клубаў-бібліятэк ды бібліятэк-клубаў. І пэўная колькасць чытачоў, у тым ліку гарадскіх, — за шматфункцыянальныя ўстановы культуры. Сюды можна прыйсці ўсёй сям'ёй і на цэлы дзень. Дзядулі і бабулі п'юць чай у кавярні, таты і мамы гэтым часам займаюцца ў спартыўных гуртках, а дзеці далучаюцца да літаратуры. І кожная "роля" — узаемазамяняльная. Тэхналогіі тэхналогіямі, а ў бібліятэцы павінна быць цікава. І аддзелы бібліятэчнага маркетынгу проста абавязаны будаваць сваю палітыку ў гэтым кірунку.

Пляцоўка для навучання і...

Апошняя выступоўца — Марыя Грынько. І зноў — тая ж "хвароба": вельмі разважлівая, роўная, а таму пазбаўленая эмацыйнай яркасці прэзентацыя… Марыя так бачыць будучыню ўніверсітэцкай бібліятэкі: апошняя стане месцам для духоўных стасункаў. А складнікі паспяховай установы наступныя: інфармацыйныя рэсурсы, стабільны кантынгент чытачоў, высокакваліфікаваныя кадры, пляцоўкі для навучання і адпачынку.

Першая ўмова бясхмарнай будучыні: упэўненае замацаванне ў сеткавым інфармацыйным асяродку. Другая: адсутнасць чытацкага дэфіцыту. Трэцяя: бібліятэкары, якія павінны стаць кансультантамі, куратарамі, эксперыментатарамі, маркетолагамі (для прыцягнення дадатковых грашовых сродкаў) і псіхолагамі.

Малайчыны! Але...

Як бы там ні было, а маладых мы слухалі з цікавасцю. Малайчыны! Яны цудоўна арыентуюцца ў інфармацыйных тэхналогіях, не менш добра ўяўляюць, як ёсць і як павінна быць. Так, спецыялісты з такім мізэрным працоўным стажам пакуль не здолелі дасягнуць таго ўзроўню, які прынята называць "прафесійным артыстызмам". Тычыцца гэта і самапіяру, і дакладнага бачання бібліятэчных праблем, асабліва — у сельскай мясцовасці, дзе пра Інтэрнэт нярэдка пакуль толькі чулі. Спадзяёмся, час вылечыць ад "дзіцячых" хвароб.

Адной з іх лічым і наступную. Яе "эпікрыз" агучыла напрыканцы мерапрыемства дзяўчына-бібліятэкарка з залы: "Калі ж вы нас маркетынгу навучыце?".

Дзіўная рэч: які ўжо год ці не пры абласных і раённых бібліятэчных структурах дзейнічаюць аддзелы бібліятэчнага маркетынгу. Але і сёння не кожны ведае, што яны павінны рабіць. Ці ж толькі дадатковыя грашовыя сродкі адшукваць? Дык мо калі пытанне зняць з парадку дня, будучыня беларускай бібліятэкі будзе выглядаць больш акрэслена?..

Мы, журналісты "К", папрасілі арганізатараў дыскурсу, каб наступная сустрэча прайшла не ў НББ, а ў раёне, дзе гаворка пайшла б аб праблемах раённых, аграгарадоцкіх і сельскіх бібліятэк, будучыня якіх, на наш погляд, не такая бесклапотная, як у сталічных ды абласных устаноў.

Яўген РАГІН і Кастусь АНТАНОВІЧ
Фота Кастуся АНТАНОВІЧА

БЯРОЗАЎШЧЫНА

Ля вытокаў стварэння калектыву стаялі Мікалай Пятніцкіх, Іван і Анэла Панюцічы, Марыя Пазняк, Дар'я Пярова, Марыя Логінава, Мікалай Галаганюк, Сцяпан Коўп, Іван Якаўлеў, Міхась Юрчанка…

Паступова ў "Памяць сэрца" ўліваліся і ветэраны працы. Калектыў стаў народным. Цяпер у ім — 30 спевакоў, якія выступаюць па ўсім раёне. Пабывалі з гастролямі і на Брэстчыне, і ў Мінску.

Кіруе "Памяццю сэрца" Кацярына Шэшка. Сёння яна з сябрамі падбірае рэпертуар для новай канцэртнай праграмы ў гонар 70-годдзя Вялікай Перамогі над фашысцкімі захопнікамі.

Іван АСКІРКА
Бяроза
Фота аўтара

На людным месцы

"Моладзь за бяспеку"

Чарговы "дзень нараджэння" адзначыла ў кастрычніку Беларуская маладзёжная грамадская арганізацыя ратавальнікаў-пажарных (БМГАРП). Сёлета ў гонар свята прайшла двухтыднёвая акцыя "Моладзь за бяспеку", якая праводзілася ў тры этапы.

На першым этапе акцыя праходзіла ў агульнаадукацыйных установах, сацыяльных прытулках, дамах-інтэрнатах. Мерапрыемствы ў школах пачыналіся з прэзентацыі арганізацыі. Тым, хто ўступіў у БМГАРП, урачыста ўручалі членскія білеты. Дзятва ўдзельнічала ў конкурсах ды віктарынах. Таксама дэманстраваліся тэматычныя відэафільмы і творчыя нумары. Другі этап праходзіў у дамах шматдзетных сем'яў, ветэранаў ВАВ, пенсіянераў, што жывуць адны, інвалідаў. Этап уяўляў з сябе аказанне шэфскай дабрачыннай дапамогі. Супрацоўнікі МНС разам з актывістамі БМГАРП дапамагалі ў побытавых пытаннях: устаноўка аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка, уборка тэрыторыі і г.д. Фінальнае ж мерапрыемства — канцэртная праграма — адбылося ў буйным гандлёвым цэнтры.

Аднак акцыя "Моладзь за бяспеку" — гэта ўсяго толькі невялікая частка таго, чым жыве арганізацыя. Штогод пад эгідай БМГАРП праходзіць мноства прафілактычных, навучальных, спаборніцкіх і забаўляльных мерапрыемстваў, непасрэднымі ўдзельнікамі якіх становяцца юныя ратавальнікі. Сёння ні адно значнае мерапрыемства як у абласных цэнтрах, так і ў рэспубліцы не абыходзіцца без БМГАРП — ці гэта свята горада, шанаванне ветэранаў або свята для навучэнцаў, ці гэта розныя канцэртныя праграмы, грамадскія мерапрыемствы прафілактычнай скіраванасці.

Вельмі высокі аўтарытэт арганізацыі і ў дзяржаўных структур — органаў улады, іншых грамадскіх арганізацый. Пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры штогод ладзяцца рэспубліканскія мерапрыемствы і акцыі, скіраваныя на прапаганду прафесіі ратавальніка-пажарнага, навучанне насельніцтва ды працуючых, дзяцей і моладзі асновам бяспекі жыццядзейнасці, папулярызацыю БМГАРП і прыцягненне ў арганізацыю хлопчыкаў і дзяўчынак.

Адзін з важных кірункаў дзейнасці БМГАРП — пажарна-выратавальны спорт. Беларускія хлопцы неаднаразова станавіліся прызёрамі розных чэмпіянатаў і ўдзельнічалі ў міжнародных першынствах.

Супрацоўніцтву моладзі розных дзяржаў у галіне бяспекі жыццядзейнасці сёння аказваецца ўсялякая падтрымка і садзейнічанне. Менавіта з гэтай мэтай колькі гадоў таму была створана Міжнародная асацыяцыя маладзёжных грамадскіх арганізацый пажарных-ратавальнікаў, у якую ўваходзяць БМГАРП, Усерасійскі дзіцяча-юначы рух "Школа бяспекі", Усеўкраінскі рух "Школа бяспекі", грамадскія арганізацыі юных ратавальнікаў Латвіі, Літвы і Польшчы.

Таццяна БЫЧАНОК,
спецыяліст групы прапаганды і навучання Савецкага РАНС Мінска

Акцэнты Крупак

Галоўнае багацце Крупскага раёна — людзі не застаюцца па-за ўвагай. Тут — 25 клубных устаноў, краязнаўчы музей, мастацкая галерэя, школа мастацтваў, Дом рамёстваў, бібліятэкі. Культурную місію ажыццяўляюць 217 работнікаў галіны. Адна з працоўных паездак міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова нядаўна адбылася менавіта ў Крупкі.

Старшыня Крупскага райвыканкама Ігар Часнок, энергічны і дзелавы гаспадар раёна, выказаўшы падзяку за візіт, адразу звярнуўся з просьбай дапамагчы правесці ў Крупках пленэр скульптараў:

— У нас шмат камянёў — выдатнага матэрыялу для скульптара. У гарадскім парку мы хочам стварыць алею скульптур. На дапамогу прафесіяналаў не разлічваем з эканамічнага пункта гледжання, а калі б студэнты Акадэміі мастацтваў змаглі прыехаць да нас на практыку...

(У працэсе сустрэчы адбылася тэлефонная размова міністра з рэктарам Акадэміі мастацтваў Міхаілам Баразной, вынікам якой стала дамоўленасць аб правядзенні вясной наступнага года ў Крупках фестывалю-пленэру для студэнтаў — будучых скульптараў.)

На сустрэчу з міністрам прыйшлі кіраўнікі розных устаноў культуры раёна: дырэктар краязнаўчага музея Тамара Бальбот, кіраўнік ЦБС Наталля Купрыянава, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Алена Дамаронак і яе намеснік Таццяна Мельнік, дырэктар Дзіцячай школы мастацтваў Міхаіл Несцярчык, дырэктар Дома рамёстваў Таццяна Сухаплюева, а таксама намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Святлана Баранок, і намеснік старшыні райвыканкама Андрэй Вараб'ёў.

Крупскі раён багаты на культурныя традыцыі. У год Кнігі ў Халопенічах, радзіме бацькі Максіма Багдановіча — Адама Ягоравіча, прайшло свята паэзіі. Памежны фестываль эстраднай рэтрапесні "Залатая мелодыя" праводзіўся на мяжы трох абласцей: Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай.

Міністр культуры прапанаваў:

— Кожны раён мае сваю "візітоўку". Я думаю, трэба ісці ад асобы. У Беларусі — трое касманаўтаў. Адзін з іх — ураджэнец Крупскага раёна Уладзімір Кавалёнак. Можа, стварыць фестываль песні пад назвай "Зямля ў ілюмінатары"? І — праводзіць яго на мяжы трох абласцей, — прапанова міністра культуры была выслухана з цікавасцю.

Дырэктар краязнаўчага музея Тамара Бальбот распавяла пра музейную калекцыю:

— У нас — 9 500 экспанатаў, амаль усе яны падораны жыхарамі раёна. Толькі тры экспанаты набыты за грошы…

Экспазіцыя музея ўяўляе цікавасць. Па ўнікальнасці некаторых экспанатаў ён можа паспаборнічаць са сталічнымі. У асаблівым раздзеле прадстаўлены лётны касцюм земляка, двойчы Героя Савецкага Саюза, касманаўта Уладзіміра Кавалёнка. І не толькі: тут нават цюбікі з касмічнай ежай ды іншыя атрыбуты касмічных палётаў.

У асобнай зале ўстановы — выстаўка калекцыянера, патомнага казака Ігара Бабіцкага "Беларусь. Салдаты Перамогі". На выстаўцы дэманструецца салдацкая амуніцыя розных родаў войскаў, пілоткі, фуражкі, плакаты, ордэны і медалі часоў Вялікай Айчыннай вайны.

— Марым стварыць міні-планетарый, — дырэктар музея распавядае пра свае планы. — Вядзём летапіс — паданне аб зямлі Крупскай ад старажытных часоў да нашых дзён...

У бліжэйшы час раённая бібліятэка пераедзе ў новы адрамантаваны будынак. Наталля Купрыянава задаволена: і кнігам, і чытачам будзе ўтульна.

Юрый ІВАНОЎ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Крупскі раён — Мінск
На здымку (справа — налева): Барыс Святлоў, Святлана Баранок, Андрэй Вараб'ёў і Алена Дамаронак.
Фота аўтара

"Кожны абавязаны...", або Чаму афіцыйна не існуе "Эпоха Леніна"?

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4 — 5.)

Прыватны музей не мае метадычнай дапамогі, фінансавання ад дзяржавы і... не жадае "легалізавацца"

Колькасць беларускіх прыватных музеяў цяжка падлічыць нават прыблізна. Прычына ў тым, што большасць з іх дэ-юрэ музеямі не з'яўляюцца: альбо мімікрыруюць пад аб'екты агратурызму, спараджаючы складаныя назвы кшталту "аграсядзіба "Дом-музей Апалінарыя Пупко", альбо і ўвогуле афіцыйна не існуюць — як, напрыклад, тая ж "Эпоха Леніна". Балазе законы тут не парушаюцца: ніхто ж не забараняе запрашаць у сваю хату гасцей. А грошай з наведвальнікаў Мікалай Панкрат усё адно не бярэ і ніколі не будзе браць: па прынцыповых меркаваннях, бо музей для яго — бы святыня.

Нежаданне калекцыянераў "легалізавацца" — цалкам зразумелае. У сённяшніх варунках набыццё статуса дадасць такім прыватным ініцыятывам клопату (ды і само па сабе гэта клопат), а вось палёгкі — аніякай.

У турыстычнай сферы Беларусі ўжо ёсць нарматыўны акт, які выклікае шчырае захапленне замежнікаў, — Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб развіцці аграэкатурызму. Уласнікі сядзіб атрымалі афіцыйны статус без пакутлівай "бухгалтэрыі", моцную інфармацыйную падтрымку, магчымасць браць ільготныя крэдыты пад развіццё сваёй справы (вось, дарэчы, і варыянт вырашэння праблемы з "замарожаным" будаўніцтвам)... І вынікі сведчаць самі за сябе.

Як падаецца, такі падыход мог бы стаць узорам і ў іншых, "сумежных" сферах турыстычнай дзейнасці, а прыватныя музеі, несумненна, належаць да іх ліку.

■■■

Зразумела, што стымуляваць развіццё прыватных музеяў нейкімі дырэктыўнымі мерамі ніяк не атрымаецца: тут усё залежыць выключна ад імпэту саміх стваральнікаў. І — не пабаімся пафасу — іх грамадзянскай пазіцыі. Экспазіцыю "Эпохі Леніна" распачынае вытрымка з Артыкула 54 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: "Кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці". Вось Мікалай Панкрат і выконвае гэты артыкул — так, як можа, і так, як умее.

І таму, напэўна, самае галоўнае — гэта ўсяляк засведчыць, што дзяржаве такія пачыны патрэбны. Стварыць для іх камфортнае эмацыйнае ды інфармацыйнае асяроддзе. А ўвага, як вядома, не патрабуе асобных артыкулаў у бюджэце.

А ў тым, што такія ініцыятывы і сапраўды патрэбны, і сумневаў узнікаць не можа. Разам з "Эпохай Леніна"на згаданым інфармацыйным шчыце прадстаўлена трынаццаць музейных праектаў. "Нешчаслівы лік" ужо састарэў: не так даўно ў Полацку адкрыўся яшчэ адзін прыватны музей, прысвечаны рыцарскай тэматыцы. І, як падаецца, такая статыстыка апраўдвае знак "Цэнтра Еўропы» не горш за геадэзічныя вымярэнні.

Ілья СВІРЫН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Полацк — Мінск
Фота аўтара

Мы вельмі рэдка звяртаем увагу на рэгіёны, што знаходзяцца, так бы мовіць, пры абласных цэнтрах. Тым больш — на Мінскі раён, які нібыта знаходзіцца ў цені сталіцы. Між тым, менавіта гэтая акалічнасць дадае рабоце тамтэйшых аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адказнасці ды напружанасці. І распавесці пра задачы ды праблемы Брэсцкага, Віцебскага, Гомельскага, Гродзенскага, Магілёўскага і Мінскага раёнаў — не сякеру пад лавай знайсці.

Стратэгія начальніка аддзела

Прысталічча: кадры — з першага курса

Сяргей КУДЗІН, Мінскі райвыканкам:

— Асноўныя нашы задачы: кадры, матэрыяльна-тэхнічная база, стварэнне ўмоў для камфортнай плённай працы… Натуральна, аддзел не можа істотна паўплываць на рост заробкаў нашых работнікаў культуры. Але геаграфічнае становішча раёна дазваляе, на шчасце, даволі эфектыўна працаваць з навучэнцамі сталічных навучальных устаноў, у першую чаргу — Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Сёння мы стараемся "назапасіць" сабе кадры літаральна з першага, другога курсаў, найперш тых, хто мае за плячамі вучылішча. У нас з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй — 96 працэнтаў работнікаў культуры. Пагадзіцеся, гэта паказчык...

У памяшканні сядзібы графа Чапскага ў Прылуках размешчаны НДІ аховы раслін. Так, будынак падтрымліваецца ў належным стане. Але сядзіба непадалёк ад Мінска магла б стаць папулярным тураб'ектам.

Базу значна палепшыла Дзяржпраграма адраджэння і развіцця сяла. Грошай на рамонты выдаткоўваецца цяпер, канешне ж, меней. Тым не менш, упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінскага райвыканкама рамантуе нам капітальна два аб'екты культуры: у Мачулішчах і Калодзішчах.

Хацелася б, безумоўна, каб большая ўвага надавалася нашаму Заслаўскаму музею-запаведніку. Свае праблемы — і ў сядзібы графа Чапскага ў Прылуках. Вы ведаеце, што ў яе памяшканні размешчаны Навукова-даследчы інстытут аховы раслін. З аднаго боку, гэта няпепска, бо будынак падтрымліваецца ў належным стане. З іншага ж, сядзіба, якая знаходзіцца непадалёк ад Мінска, магла б стаць (пры ўмове перадачы яе на баланс аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі) адным з найпапулярнейшых турыстычных аб'ектаў. Трэба толькі знайсці новае месца для НДІ…

Не буду шмат казаць пра наш актыўны фестывальны рух. Зазначу толькі, што мы пастаянна імкнёмся да таго, каб нашы мастацкія калектывы экспартавалі беларускае традыцыйнае мастацтва за мяжу. Гэта ж прэрагатыва не толькі памежных раёнаў! У сувязі з тым хацелася б узняць і пытанне больш эфектыўных стасункаў з прыватным бізнесам. Праблема, як падаецца, — у стварэнні больш спрыяльных умоў для спонсараў. Аддзел ратуе тое, што сельскія саветы раёна пасля продажу зямельных участкаў з аўкцыёнаў сёе-тое са сродкаў выдаткоўваюць і для развіцця культуры. У гэтым — яшчэ адна асаблівасць прысталічнага рэгіёна. Грошы выкарыстоўваем для дробных рамонтаў, набыцця музычных інструментаў. Такое сяброўства з сельсаветамі і прынята называць узаемакарысным сацыяльным партнёрствам.

"Чабатухі" на экспарт, або "Раскруціць" аўтэнтыку

Ці рэальныя замежныя гастролі для самабытнага ансамбля з Палесся?

Напрыканцы кастрычніка ў Падляшскім ваяводстве Польшчы адбыўся шэраг імпрэз, які зладзіў аўтэнтычны жаночы гурт "Чабатухі" з Пінскага раёна. "Вэчоркі", якія прадставілі паляшучкі жыхарам Беласточчыны, настолькі прыйшліся даспадобы жыхарам суседняй краіны, што ансамбль атрымаў шэраг прапаноў наведаць Польшчу і ў наступным годзе. Але гаворка ў артыкуле — не толькі пра ўдалае выступленне калектыву з Беларусі, а і пра тое, якія магчымасці могуць атрымаць культработнікі краіны, калі пачнуць шырэй прэзентаваць свае аўтэнтычныя ансамблі за яе межамі.

"Вэчоркі" са Сташанаў

Звонкія спевы, задорныя танцы і народныя гульні — вось што такое "Вэчоркі", якія прэзентавалі ў Польшчы пінскія арысты. А сама задума аднавіць традыцыю вячорак — танцавальна-спеўных сустрэч — у дырэктара "Музея малой Бацькаўшчыны ў Студзіводах" Дарафея Фіёніка выспела даўно (пра гэтага цікавага і адметнага чалавека "К" пісала неаднойчы). Каб зладзіць мерапрыемства, што называецца, на найвышэйшым узроўні, ён і паклікаў сабе на дапамогу бабуль са Сташанаў.

Вядома, калісьці менавіта на вячорках моладзь знаёмілася. Хлопцы прыглядаліся да дзяўчат, дзяўчаты — да хлопцаў. Глядзелі, наколькі хто спрытны ў скоках ды гульнях, дасціпны ў жартах. І нягледзячы на тое, што аўтэнтычная абраднасць вячорак адышла ў мінулае, удзельнікі тых сустрэч, якія адбыліся ў Польшчы, лічаць, што гэтую традыцыю неабходна, прынамсі, працягваць.

Пінчукі ўразілі шматлікіх гледачоў, сярод якіх былі і стары і малы не толькі адметнымі палескімі строямі ды показкамі пра старадаўнія часы, але і сваімі спевамі ды танцамі. Прычым напрыканцы вечарын госці разам з няўрымслівымі "чабатушкамі" самі пачыналі спяваць палескія песні ды танчыць падэспань, кракавяк, польку ды "Каробачку".

"Піяр" аўтэнтыкі

Інтэрв'ю для сродкаў масавай інфармацыі Беластоцкага краю, аб'явы аб канцэртах па радыё і тэлебачанні… Такі "піяр" на Падляшшы быў зладжаны для аўтэнтычнага фальклорнага гурта "Чабатухі". Натуральна, маштабнай рэкламнай кампаніі пінскі калектыў абавязаны не толькі сваёй самабытнасцю. Вялікая праца па "раскрутцы" гасцей з Беларусі была зроблена тым самым Дарафеем Фіёнікам. Менавіта ён запрасіў на Беласточчыну беларускі калектыў. Дарэчы, "Чабатухі" ўжо бралі ўдзел у мясцовых падляшскіх фальклорных фестывалях "Там, по маёвуй росі" і "Олень по бору ходіт".

Ансамбль "Чабатухі" з Піншчыны.

Цікавы, на мой погляд, не толькі той факт, што запрашэнне для калектыву з Пінскага раёна даслаў кіраўнік прыватнага этнаграфічнага музея, але і тое, што беларускія артысты выступалі са сваімі імпрэзамі ў розных грамадскіх арганізацыях. У Беластоку гэта было аб'яднанне "АБ-БА" на карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову, у вёсцы Дубічы Царкоўныя і Ліпінах — мясцовыя ініцыятыўныя групы, што прапагандуюць культурныя традыцыі.

Такі вопыт супрацоўніцтва з грамадскімі аб'яднаннямі цалкам магчыма пераняць і ў Беларусі. Ёсць у нас шмат цікавых прыватных музеяў і галерэй. Чаму б і ім не ладзіць сумесныя імпрэзы са сваімі паплечнікамі з розных краін Еўропы? Фінансаванне, дарэчы, можна было б атрымаць пры дапамозе таго ж прадстаўніцтва ААН у Беларусі. Неабходна толькі парупіцца пра стварэнне праекта ды падаць заяўку на грант. Бо, як вядома, з прыватнымі арганізацыямі ў Еўропе працуюць даўно, таму і грошы на сумесныя культурныя імпрэзы атрымаць будзе, як падаецца, не так ужо і складана.

Крыху пра сумнае

Але гаворка — не толькі пра адраджэнне традыцый. На свае вочы бачыў, як захоплена глядзелі на танцы бабуль маладыя і сталыя палякі, з якім задавальненнем слухалі традыцыйныя палескія спевы, як радасна ўдзельнічалі ў тых народных гульнях, што прапаноўвалі гасцям беларускія артысты!.. І задаўся пытаннем: ці ўмеем мы, беларусы, напоўніцу цаніць тое, што маем? Радавацца аўтэнтычным спевам, развучваць народныя танцы, захапляцца традыцыямі продкаў? Адказ, хутчэй за ўсё, будзе адмоўны…

На жаль, трэба прызнаць, што папса і пагоня за модай адсунулі традыцыйнае беларускае мастацтва (спевы, танцы, рамёствы) на ўзбочыну культурнага жыцця. І тыя ж "Чабатухі", хоць і выступалі неаднойчы са сваімі канцэртамі далёка за межамі свайго раёна — ад Брэста да Мінска, — так і не маюць пакуль студыйных запісаў са сваімі песнямі, іх не так ужо і часта запрашаюць выступіць на радыё ці тэлебачанні. І ў Доме фальклору, дзе ладзіць рэпетыцыі ансамбль, няма ні стосаў дыскаў на продаж зацікаўленаму турысту ці нават заезджаму журналісту, няма ніякіх прэзентацыйных буклетаў… Ды і сама хатка, дзе месціцца Сташанскі дом фальклору, які год ужо патрабуе рамонту і даглядаецца самімі жанчынамі…

І апошняе. Частымі выездамі за мяжу могуць пахваліцца ў першую чаргу аўтэнтычныя калектывы з Брэстчыны і Гродзеншчыны. А што ж іншыя вобласці? Няўжо там няма адметных ансамбляў, якія здольныя зацікавіць еўрапейцаў? Вядома ж, ёсць. Толькі не заўсёды яны выязджаюць нават за межы свайго раёна. А шкада. Бо годна прадставіць традыцыйную беларускую культуру ў іншых краінах яны маглі б без асаблівых цяжкасцей. Праўда, спачатку тую ж аўтэнтыку варта навучыцца цаніць самім беларусам…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Рэйтынг ідэй з internet-прасторы

Канцэртмайстар — пра віртуальнае

Для ансамбля, які прадстаўляе беларускія народныя песні і танцы, важна прыцягнуць увагу да сваёй дзейнасці. Асабліва калі гаворка ідзе пра дзіцячую творчасць. І, зразумела, дзе Інтэрнэт — там і дзеці.

Алена МЕЛЯШЧОВА, канцэртмайстар, кіраўнік падрыхтоўчай групы Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь "Ансамбль народнай музыкі "Ярыца" Абласнога цэнтра творчасці Магілёва

1. Сайт

У Сеціве ёсць сайт Абласнога цэнтра творчасці uocvr.by, на якім прадстаўлены ўсе кірункі дзейнасці нашай установы. Ёсць і сайт уласна ансамбля "Ярыца" (jaryca.narod.ru). Кожны можа азнаёміцца з творчай дзейнасцю калектыву, яго дасягненнямі, праслухаць запісы з выступленняў, паглядзець фотаздымкі. Акрамя таго, па Інтэрнэце прыходзяць запрашэнні на ўдзел у розных рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах, а гэта дазваляе пашырыць творчую дзейнасць ансамбля.

2. Фотаздымкі

У асяроддзі дзіцячай культурнай дзейнасці важна, каб усе поспехі знайшлі сваё адлюстраванне і ў віртуальнай прасторы. Шматлікія канцэрты, фестывалі, конкурсы, у якіх удзельнічаюць юныя артысты, знаходзяць сваё адлюстраванне ў фотаздымках, якія можна сустрэць на сайце як ансамбля, так і ўстановы, на базе якой працуе творчы калектыў. Ахапіць мноства важных падзей, у якіх удзельнічаюць дзеці, бывае складана з розных прычын. Але нават самі ўдзельнікі ансамбля ў Інтэрнэце абменьваюцца фотаздымкамі выступленняў і конкурсаў.

3. Ноты

Для працы часта даводзіцца шукаць ноты на розных сайтах. Апошнім часам у нотным варыянце прадстаўлены самы разнастайны рэпертуар: гэта не толькі дзіцячыя песні, але і народныя кампазіцыі. Для мяне як канцэртмайстра цікавы сайт notes.tarakanov.net — нотны архіў Барыса Тараканава, дзе размешчана шмат музыкі ў даволі поўным аб'ёме для ўсіх інструментаў, што сустракаецца ў інтэрнэт-асяроддзі даволі рэдка. Тут можна знайсці добрую падборку якаснага матэрыялу і, акрамя таго, літаратурна-музычную старонку.

4. Літаратура

У Сеціве можна знайсці алічбаваныя выданні беларускіх мастацтвазнаўцаў (bookfiles.net, hor.by). Да прыкладу, ёсць добрыя зборнікі для дзяцей Л.Хадановіч, В.Сярых. Але, у цэлым, бракуе фальклорнага матэрыялу, асабліва ў Байнэце. На жаль, часта атрымліваецца так, што на замежных сайтах беларускую народную музыку знайсці прасцей, чым на нашых. Нельга не адзначыць работу па абнаўленні інфармацыі на сайце Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі (nchtdm.com). Усе педагогі дадатковай адукацыі могуць знайсці там шмат карыснай інфармацыі.

5. Народнае

Інтэрнэт дае вялікія магчымасці для папулярызацыі беларускай народнай культуры. Але задзейнічана, як падаецца, малая частка з іх. Часта даводзіцца шукаць беларускую народную музыку, фанаграмы да народных песень, і, што дзіўна, на нашых сайтах іх няшмат, у адрозненне ад тых жа расійскіх. Відэазапісы выступленняў прафесійных калектываў, такіх як "Харошкі", "Песняры", "Бяседа", "Свята", можна знайсці ў Байнэце. Але мала матэрыялу па самадзейных калектывах. Увогуле, фальклору прысвечана няшмат сайтаў. Бракуе аб'ёму інфармацыі, яе прафіляванасці, таму тут ёсць вялікая прастора для развіцця.

Занатавала Вольга НАВІЦКАЯ

Асоба

Янушкевіч, які зазірнуў у будучыню

З Койданава — у **качавы свет**

Напрыканцы мінулага тыдня на Дзяржыншчыне ўшанавалі памяць славутага земляка — пісьменніка і навукоўца Адольфа Янушкевіча: сёлета спаўняецца 210 гадоў з дня ягонага нараджэння. Акрамя мясцовых жыхароў, прадстаўнікоў улады, навукоўцаў і журналістаў з Мінска, у мерапрыемствах бралі ўдзел госці з Казахстана, і сярод іх — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь Ергалі Булегенаў.

Цікавасць гасцей з геаграфічна далёкай ад Беларусі краіны да асобы Адольфа Янушкевіча тлумачыцца тым, што ён, бадай, першым з еўрапейцаў зрабіў культуралагічна карэктнае і навукова дакладнае апісанне жыцця ды побыту казахаў. Варта ўдакладніць, што ў азіяцкі стэп Адольфа Янушкевіча прывёў не пошук новых уражанняў, а — драматычныя варункі лёсу. Ён трапіў сюды не сваёй воляй, а як ссыльны за ўдзел у паўстанні 1830 года. Сумуючы па радзіме, лекаваўся працай. Ягоныя інтэлект і творчыя здольнасці вельмі прыдаліся навуковым доследам, якім ён прысвяціў сваё знаходжанне ў Казахстане.

Шчырая, добразычлівая цікавасць да людзей стэпу, павага да іхніх звычаяў і культуры зрабілі Янушкевіча сваім чалавекам сярод качэўнікаў. Сам жа Адольф прыкіпеў сэрцам да гэтага краю і людзей. У лістах дадому ён называў насельнікаў стэпу не інакш, як "мае любімыя кіргізы" (кіргізамі ў Расійскай імперыі ў той час называлі ўсіх качэўнікаў Сярэдняй Азіі). Свае ўражанні ад вандровак да Какчэтава і Акмолінска ён занатаваў у "Лістах з кіргізскага стэпу". Яны былі надрукаваны толькі пасля смерці аўтара. А іх пераклад на казахскую мову з'явіўся не так даўно ў Астане — горадзе, які Янушкевіч ведаў як Акмолінск і якому прадракаў вялікі лёс. "Гэта будзе сталіца ўсяго стэпу", — пісаў ён.

Пра Адольфа Янушкевіча можна сказаць, што ён належыць да кагорты інтэлектуалаў, якія закладалі асновы еўразійскай версіі глабалісцкай ідэі. Ён бачыў Захад і Усход не адвечнымі сапернікамі, а суб'ектамі цывілізацыі, якім геаграфічны стан і гісторыя наканавалі быць разам.

Янушкевічу пашчасціла вярнуцца на радзіму і спачыць у беларускай зямлі. Ён быў пахаваны на фамільных могілках у вёсцы Дзягільна, што непадалёк ад сённяшняга Дзяржынска. Дзякуючы ініцыятыве мастакоў Валяр'яна і Фелікса Янушкевічаў, якія з'яўляюцца нашчадкамі Адольфа, намаганням краязнаўцаў ды патрыётаў гэтай зямлі, падтрымцы мясцовай улады занядбаныя колісь могілкі набылі прыстойны выгляд, і іх добраўпарадкаванне працягваецца. На магіле Адольфа Янушкевіча ўстаноўлены памятны знак, адрэстаўравана магіла яго маці, пасаджаны дрэвы на Алеі Памяці…

Прысутныя на імпрэзе ўсклалі кветкі да магілы выдатнага навукоўцы. Гучалі словы пра пазачасавае значэнне літаратурнай спадчыны Адольфа Янушкевіча, пра ягоны ўнёсак у гістарычную перспектыву, у сённяшнія братэрскія стасункі Беларусі і Казахстана.

Тым жа днём у Дзяржынску, у Цэнтральнай раённай бібліятэцы, прайшлі Міжнародныя Койданаўскія чытанні. У сваёй прамове Адам Мальдзіс згадаў, што нашы польскія калегі, беспадстаўна атаясамліваючы Рэч Паспалітую і Польшчу, трактуюць асоб кшталту Адольфа Янушкевіча як польскіх патрыётаў, а іх дзейнасць — як скіраваную на адраджэнне польскай дзяржаўнасці. Тое не адпавядае рэчаіснасці: згаданыя асобы былі патрыётамі гэтай зямлі, называлі сябе, згодна з гістарычнай традыцыяй, ліцвінамі, а Рэч Паспалітую як магчымую гістарычную перспектыву бачылі не польскай дзяржавай, але фэдэрацыяй свабодных народаў. Прафесар Мальдзіс раіць зыходзіць з гэтай тэзы ўсім, хто даследуе час паміж ліквідацыяй Рэчы Паспалітай і распадам Расійскай імперыі.

Вольга Гарбачова, даследчык жыцця і дзейнасці Адольфа Янушкевіча, падзялілася з прысутнымі звесткамі, якія знайшла ў архівах Беларусі і замежжа. Паводле яе слоў, атрымліваецца, што нашы навукоўцы лянуюцца не толькі выправіцца ў вільнюскія, варшаўскія ці маскоўскія архівы, але і кепска ўяўляюць нават тыя дакументы, што ёсць у архівах беларускіх.

З павагай казаў пра даследчыка XIX стагоддзя госць з Казахстана — пісьменнік, навуковец, кнігавыдавец Амар Хакім. Ён прыводзіў вытрымкі з ягоных тэкстаў, прысвечаных прыродзе і людзям Казахстана — гэтага, паводле слоў Янушкевіча, "качавога Сусвету". Госць распавёў прысутным пра тое, як у Казахстане шануецца памяць нашага земляка.

Аспекты жыцця і дзейнасці Адольфа Янушкевіча асвятлілі і іншыя ўдзельнікі Чытанняў. А напрыканцы выступілі дзяржынскія школьнікі, якія падрыхтавалі калектыўную працу, прысвечаную славутаму земляку. Падсумоўваючы ж уражанні ад імпрэзы, можна канстатаваць, што ў гісторыі, бадай, кожнага беларускага паселішча ёсць постаці, якія ў навакольным свеце вядомыя больш, чым на сваёй радзіме. Прынамсі, ні ў Мінску, ні ў Дзяржынску няма нават вуліцы імя Адольфа Янушкевіча. Ёсць пра што задумацца…

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Дзяржынскі раён — Мінск

Фатаграфічная калекцыя

У маім хатнім архіве захавалася шмат старых фота, што паказваюць моманты з жыцця беларускіх мастакоў розных гадоў, пачынаючы з даваеннага часу. Трапілі яны да мяне рознымі шляхамі: хтосьці іх мне проста падарыў, штосьці засталося ад унікальнай выстаўкі фатаграфій, якія я збіраў у мастакоў і на іх аснове напрыканцы 1970-х зладзіў экспазіцыю ў Палацы мастацтва (у гонар 40-годдзя з часу I З'езда мастакоў БССР). Частка здымкаў з гэтай экспазіцыі так і засталася ў мяне з дазволу іх уладальнікаў (або пасля іх смерці). Прадстаўляем два фота з той калекцыі.

Барыс КРЭПАК

Мастакоўская "эліта" 1950-х. Перад дэманстрацыяй 7 лістапада 1958 г. Пяты злева — народны мастак БССР Заір Азгур; дзявяты (стаіць у профіль) — народны мастак БССР Іван Ахрэмчык.

Мастакі-педагогі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута на дэманстрацыі 7 лістапада 1961 г. у Мінску. Злева направа: Г.Мурамцаў, А.Анікейчык, А.Веліксонаў, У.Сухаверхаў з дачкой Наталляй.

Колас інтэрактыўны



Пад час адкрыцця мабільнай бібліятэкі на плошчы Якуба Коласа ў Мінску.

Чарговы раз у сценах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа прайшло XXVIII Літаратурнае свята "Каласавіны".

У рамках свята ў музеі адбыўся Міжнародны "круглы стол" "Мемарыяльны музей і грамадства. Захаванне культурнай спадчыны. Музей ва ўмовах развіцця новых інфармацыйных тэхналогій". Сама сутнасць музея патрабуе грунтоўнага адбору ў выкарыстанні сучасных тэхнічных сродкаў. Гэта не азначае адмовы ад іх, аднак сведчыць пра неабходнасць далікатнага стаўлення да ўжывання такіх фарматаў. Усё павінна адпавядаць індывідуальнай атмасферы кожнага асобна ўзятага мемарыяльнага музея, пра якія і вялася гаворка. Удзельнікамі ж пасяджэння сталі, апроч супрацоўнікаў мінскіх літаратурных і мемарыяльных музеяў, госці з Украіны і Расіі.

Гасцям дома Коласа быў прадэманстраваны інтэрактыўна-мультымедыйны комплекс "Якуб Колас. Чалавек. Асоба. Час", адбылася прэзентацыя гукавой інтэрактыўнай зоны ў мемарыяльным рабочым кабінеце Песняра, які быў галоўным месцам у доме для самога класіка.

Але, як і штогод, найярчэйшай падзеяй "Каласавін" стала Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя. Сёлета яна была прысвечана 90-годдзю выхаду з друку паэмы Якуба Коласа "Новая зямля". Наогул, 90-годдзе з часу выхаду асобным выданнем паэмы "Новая зямля" Якуба Коласа шырока адзначалася ў Музеі Песняра і цягам года. Літаратурным паралелям, параўнанню паэмы "Новая зямля" з іншымі знакамітымі творамі сусветнай літаратуры прысвечаны цыкл вечароў у рамках Міжнароднага літаратурнага праекта "Зямля — аснова ўсёй Айчыны". Да гэтай юбілейнай даты былі створаны выстаўкі з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, якія экспанаваліся і экспануюцца не толькі ў абласных цэнтрах, раённых гарадах, але і ў Літве, Расіі. У філіяле "Мікалаеўшчына", на мемарыяльнай сядзібе Альбуць, створана экспазіцыя, прысвечаная паэме "Новая зямля", а таксама — пастаянная выстаўка "Пчалярства і рыбалоўства".

А напярэдадні дня нараджэння класіка на альбуцкай зямлі адбылося адкрыццё першай чаргі экспазіцыі "Прырода ў жыцці і творчасці Якуба Коласа", інтэрактыўнай зоны "Хатка знахаркі". Першыя наведвальнікі даведаліся пра лекавыя травы, якія з дзяцінства былі вядомы будучаму паэту, таму што прысутнічалі ў "зялёнай аптэчцы" маці, пачулі шматлікія народныя рэцэпты для лячэння розных захворванняў, пакаштавалі гарбаты з зёлак Стаўбцоўшчыны.

З лістапада, у дзень нараджэння Песняра, пасля ўрачыстага ўскладання кветак да помніка яму, Музей Якуба Коласа сумесна з адным з мабільных аператараў прэзентаваў першы ў рэспубліцы інавацыйны адукацыйны праект "Мабільная бібліятэка". Радуе тое, што сярод першых чытачоў "мабільнай бібліятэкі" творы Якуба Коласа карысталіся папулярнасцю.

Чаму Міхаіл Станюта пры жыцці меў толькі адну персанальную выстаўку?

“Мой тата ва ўсім быў мастаком...”

...Незадоўга да смерці, у сярэдзіне 1973-га, прыкладна ў той час, калі Станюта пісаў партрэты, дзе я быў у якасці мадэлі, ён намаляваў другі, пасля 1921 года, “Аўтапартрэт” — своеасаблівы запавет. Цяпер ужо, у адрозненне ад таго маладога і натхнёнага чалавека, вусы былі адвіслыя ды сівыя, а замест капелюша — старая цёмная кепачка, пакамечаная і друзлая, ссунутая на адзін бок і падобная здалёк на берэт, што калісьці насіла мастачка і яго сяброўка Пальміра Любаміраўна Мрачкоўская, у чый дом хадзіў некалі вучыцца малады Міша, — берэт, пра які ён потым казаў: “Як на аўтапартрэце ў Рафаэля...”

(Заканчэнне. Пачатак у № 43, 44)

Што да Мрачкоўскай, то, на жаль, сёння пра яе мала хто ведае, хаця яна была вельмі цікавай жанчынай і таленавітай мастачкай. Ейны ўласны дом ды іншыя дамы, што належалі яе бацьку, стаялі там, дзе цяпер вуліца Захарава выходзіць да плошчы Перамогі — якраз за хлебнай крамай на рагу. Дарэчы, калі Кругер у 1906 годзе адкрываў сваю Рысавальную школу ў Мінску, вялікую матэрыяльную, так бы мовіць, спонсарскую, дапамогу ёй аказала менавіта гэтая жанчына-мецэнатка.

Стэфанія Станюта: “...Увечары, калі бацька займаўся ў Пальміры Любаміраўны, мы разам з маці, чакаючы яго, хадзілі сюды ды глядзелі ў вокны вялікай веранды Мрачкоўскай: у яркім святле дома нам было добра відаць на сцяне вялікую карціну “Пагібель “Тытаніка”... Можа, маці хадзіла туды са мной таму, што раўнавала бацьку?.. Пасля рэвалюцыі мастачцы, якая мела раней нямала зямлі пад Мінскам, пакінулі ўсё ж нешта накшталт невялічкага фальварка за Кальварыяй. Мой бацька прыходзіў да яе і сюды, браў з сабой мяне, і я запомніла, як ела, адшчыкваючы з галіны, чарэшні, як хадзілі на падворку, распускаючы свае рознакаляровыя хвасты, некалькі немаведама як ацалелых у гаспадыні райскіх птушак — паўлінаў, і як сядзелі каля прыступак жабракі, калекі, што прыходзілі сюды па дапамогу і былі “мадэлямі” мастачкі... У сорак першым, калі Мінск займалі немцы, гэты дом Мрачкоўскай загарэўся, але яна, ужо зусім старая, адзінокая, засталася на месцы, разам са сваімі карцінамі ды коткамі. “Проста, не жадала выходзіць, ратавацца, — казаў бацька. — Дый навошта?..” Ён памятаў яе такой, якой яна была ў той далёкі час, калі ён яшчэ хадзіў да яе вучыцца: з буйным выразным тварам, яркай сівізной і ў вялікім цёмным “рафаэлеўскім” берэце...”

Міхаіл Пятровіч у час нашых сустрэч расказваў мне пра гэтую жанчыну і вельмі маркоціўся, што ўсе беларускія гісторыкі мастацтва яе зусім забылі. Яна ж славілася ў горадзе сваёй незвычайнай дабрынёй і дабрадзейнасцю: дапамагала бедным мастакам, утрымлівала бяздомных старых і хворых, падкормлівала бадзяжных сабак ды катоў, вучыла сялянскіх дзяцей маляванню... Пазней, ужо за савецкім часам, сябравала з калегамі па мастацтве, з якімі з 1927 года ўваходзіла ва Усебеларускае аб’яднанне мастакоў: А.Астаповічам, А.Грубэ, Г.Віерам, В.Дваракоўскім, А.Тычынам, М.Дучыцам і, канешне ж, з М.Станютам ды М.Філіповічам, які ў 1921-м напісаў ейны цудоўны партрэт. Праз яе Міхаіл Пятровіч пасябраваў з выдатным беларускім пейзажыстам-імпрэсіяністам Уладзімірам Кудрэвічам.

Калі пані Пальміра бывала за мяжой, яна не прамінала выпадку пазнаёміцца з цікавымі людзьмі. Так, яшчэ ў юнацкім узросце, сустракалася з Гі дэ Мапасанам, незадоўга да яго жудаснай смерці. Перакладала яго раман “Моцная, як смерць”. Сябравала з княгіняй Жаннай Маргерыт дэ Саган — заканадаўцай мод, дачкой буйнага фінансавага барона Саера, якая і пазнаёміла Мрачкоўскую з аўтарам “Мілага сябра”. Трошкі ведала і Заля, і Эдмона дэ Ганкура, і Рэпіна, калі той жыў у Здраўнёве. Словам, жанчына была яшчэ тая! На жаль, не пакінула мемуараў...

М.Станюта. "Аўтапартрэт". 1972 г.

М.Станюта. "Партрэт дачкі". 1946 г.

М.Станюта. "Парк. Сонейка". 1970-я гг.

Доўгае ж жыццё Станюты было не вельмі багатае на падзеі, вартыя прыгодніцкага рамана ці фільма. Яго радзіма — горад Ігумен Мінскай губерні. Тут ён з’явіўся на свет 19 верасня (па старым стылі) 1881 года. Бацька Пётр Фадзеевіч служыў у Ігуменскай мяшчанскай управе гласным (выбраным). Шлюб яго, праваслаўнага, з каталічкай Стэфаніяй Аляксандраўнай Юшкевіч-Дулевіч быў з цягам часу скасаваны. Гэта была прыгожая, станістая жанчына, хаця і не вельмі пісьменная: да замужжа працавала служанкай у багатых дамах. (Дарэчы, менавіта ў гонар яе, Стэфаніі, і была названа дачка мастака, будучая знакамітая актрыса.) Маладая сям’я жыла сціпла. А калі ў 1905 годзе нарадзілася дачка, стала яшчэ горш. Стэфанія Міхайлаўна ўспамінала, што ў іхняй хаце заўсёды пахла не ядой, а шкіпінарам, алейнымі фарбамі і дрэвам — ад падрамнікаў. Бывалі часы, калі маці, купляючы соль ды смятану ў сялян у Лошыцы, потым перапрадавала “тавар” даражэй на мінскім рынку...

Але гаспадару дома ўсё гэта было “да фені”. Вось мастацтва — гэта святое, гэта вышэй за жыццёвыя турботы... Міхаіл Пятровіч, успамінаючы сваё дзяцінства, распавядаў: “...Рысаваннем захапіўся вельмі рана. Маляваў як мог і што мог. Перарысоўваў ілюстрацыі з кніжак, імкнуўся рабіць накіды з натуры — алоўкам ці пяром. Акварэльныя фарбы купіў ужо тады, калі стаў пісарам у мінскай канторы і на першую палучку набыў каробку акварэлі і два пэндзлікі. Дарэчы, маім першым рэпетытарам у малюнку быў Іван Пуліхаў — той самы, якога пакаралі смерцю за замах на губернатара Курлава. Павесілі 27-гадовага хлопца на варотах турмы...”.

Расповед мастака пра Пуліхава мяне тады ўразіў. Імя гэтага маладога чалавека, як і іншых рэвалюцыянераў-тэрарыстаў, якія аддавалі жыццё за ідэалы рэвалюцыі, асацыіравалася з геройствам, подзвігам, самаахвяраваннем. Зараз у Мінску ёсць вуліца імя Пуліхава, і ўсім вядома месца яго пахавання: злева ад уваходу на Вайсковыя могілкі, куды ў 1954-м яго прах быў перанесены з ліквідаваных Старажоўскіх могілак...

Зараз мы па-іншаму глядзім на ролю падобных рэвалюцыянераў у айчыннай гісторыі, але ў савецкія часы ва ўсіх кніжках ды падручніках такія “бамбісты” разглядаліся як мужныя барацьбіты з царскім самаўладдзем. Але сустрэць жывога мастака, які браў першыя ўрокі рысавання ў самога Івана Пуліхава, — гэта, канешне ж, штосьці! Потым я цікавіўся жыццём гэтага сацыяліста-рэвалюцыянера, члена лятучага атрада Паўночна-Заходняга краю, і ягонай сяброўкі па тэроры — эсэркі Аляксандры Ігнайловіч: яны адначасова зрабілі няўдалы замах на граданачальніка. “...Пуліхаў тады жыў у раёне цяперашняй вуліцы Чычэрына, — распавядаў Станюта, — і зарабляў грошы рэпетытарствам. Падобныя сродкі, як я даведаўся пазней, ішлі ў касу мінскай падпольнай эсэраўскай арганізацыі. Але Іван Мацвеевіч толк у маляванні ведаў, і я ад ягоных урокаў атрымаў добрую карысць, што дазволіла мне з часам стаць на самастойны мастакоўскі шлях ...”

А пакуль Станюта не ўстаў на самастойны творчы шлях, яму давялося папрацаваць на пасадах, вельмі далёкіх ад “святога мастацтва”: у натарыяльнай канторы, на чыгунцы, у нейкай казённай палаце... Але зярняты, кінутыя ў зямлю ў час яго вучобы ў мастацкай студыі Якава Кругера ў 1908-м — 1911-м прынеслі свой каштоўны плён. Праз сем гадоў гэта дало яму магчымасць без праблем паступіць у маскоўскія Свабодныя дзяржаўныя мастацкія майстэрні, дзе ў той час выкладалі К.Каровін, В.Кандзінскі, І.Машкоў, А.Архіпаў, Р.Фальк, П.Кузняцоў. Аднак гэта будзе потым...

Але яшчэ да сустрэчы з Кругерам малады Станюта славіўся на ўвесь Мінск як закаранелы гуляка. Яго добра ведалі не толькі на вуліцы Петраградскай, дзе ён жыў з сям’ёй у драўляным доме ля вакзала, але і далёка ад гэтага раёна. “...Я памятаю яго па чыіхсьці расповедах, — расказвала Стэфанія Міхайлаўна, — як ён едзе на рамізніку ў ссунутым на патыліцу капелюшы і раскідвае ва ўсе бакі купленыя, відаць, жонцы і дачцэ, абаранкі, замест даўно ўжо растранжыраных грошай, — шыкоўны жэст!.. Часцяком можна было бачыць бацьку з гітарай: ён граў ды спяваў. І недзе зноў знікаў. Маці здзіўлялася: “Ну толькі што во тут быў — ізноў прапаў!”... Безліч было закусачных у Мінску. Паспрабуй тут не выпіць, казаў бацька, калі ідзеш з сябрамі пасля працы, узняўшы верх шапкі над брыльком, што азначае “задаволены начальствам”, замест сумнага, насунутага на вочы “бліна”, калі, наадварот, незадаволены, — ідзеш, а на кожным рагу табе — ці то бок барана, ці то парася з халадцом (ён казаў — “з галерэткай”), ці то гусіная пячонка або шыйка...”

Калі пачалася Першая сусветная вайна, чыгуначную службу Станюты эвакуіравалі ва Уладзімір, і сям’я мастака дабіралася туды цэлы месяц у таварным вагоне. А потым вярнуліся ў Мінск, дзе перад самай рэвалюцыяй Стэфанія паспела скончыць чатыры класы гімназіі, а бацька ў 1918-м з’ехаў у Маскву на вучобу ў Свабодныя дзяржаўныя мастацкія майстэрні, на аснове якіх праз два гады быў створаны ВХУТЕМАС (Вышэйшыя мастацка-тэхнічныя майстэрні). Такім чынам, Станюта паспеў прайсці добрую школу прафесійнага майстэрства ў Абрама Архіпава і трошкі — у Ілы Машкова, Паўла Кузняцова ды Канстанціна Каровіна...

Ну а далей было ўсё проста як на далоні: Мінск і толькі Мінск — да канца доўгага жыцця, пра што я і імкнуўся сёння распавесці...

Барыс КРЭПАК

а•ф•і•ш•а «К»

З 9 ЛІСТАПАДА — ДА 16 ЛІСТАПАДА

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- **"Слуцкія паясы"** (са збору Львоўскага гістарычнага музея) — да 18 красавіка 2014 г.
- Выстаўка адной карціны ў рамках святкавання Дня горада ў Нацыянальным мастацкім музеі **"Вера — гэта дар Божы"** — да 15 лістапада.
- Міжнародная выстаўка **"Праваслаўны свет. Вобраз Хрыста ў іканаграфіі краін Усходняй Еўропы"** — да 5 снежня.
- **"Венгерская рапсодыя. Мастакі Сольнака"** — да 18 лістапада.
- Персанальная выстаўка Таццяны і Юрыя Рудэнкаў **"Толькі вечныя каштоўнасці"** — да 5 снежня

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 327 88 78.

- Пастаянныя экспазіцыі: **"Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенціна Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Магічнае святло саломы"** — да 10 лістапада.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь"**.
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
- **"Водбліскі ваеннай славы"**.
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст."**.

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Прыгожая фатаграфія. Частка 1. Непатрэбнае сваяцтва"** — да 17 лістапада.
- Выстаўка **"Сучасны японскі дызайн"** — да 21 лістапада.
- Выстаўка **"Плакатная Ленініяна"** (са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь) — да 6 снежня.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.

- **"Пастка для часу"** — выстаўка дапатопных казурак у бурштыне — да 24 лістапада.
- Выстаўка **"1917. Невядомыя вобразы"** — да 14 лістапада.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка фатаграфій **"Свет стары — свет новы"**.
- Выстаўка **"Мірскі замак як брэнд"** — да 15 снежня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а.
Тэл: 226 03 98.

Выстаўкі:
- Мастацкая выстаўка **"Мінск — ведаць, памятаць, ганарыцца"** (да Дня горада Мінска).
- Мастацкая выстаўка **"Герой. Патрыёт. Партызан"** (да 70-годдзя з дня гібелі Героя Савецкага Саюза Яна Налепкі).

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца
Выстаўкі:
- Мастацкая выстаўка **"Нацюрморт. Паэма быцця"** — да 24 лістапада.
- Выстаўка **"Чароўны свет тэатра і казкі"**, прысвечаная паўвекавой дзейнасці Гомельскага дзяржаўнага тэатра лялек, — да 10 лістапада.
- Выстаўка жывапісу **"Час кахання"** — да 18 лістапада.
- Персанальная выстаўка жывапісу Дзмітрыя Яўсеенкі.
- Выстаўка калекцыі Джорджыа Форні **"Made in Italy"** — да 15 снежня.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня"**.
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца
Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
- **"Выдатнае і вечнае"** (выстаўка літаратуры к. XIX — пач. XX стст. са збору князёў Паскевічаў).
- **"Класікі беларускага мастацтва"**.

Паўночнае крыло палаца
Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16.
Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўкі:
- **"Таямнічая сіла крыжа"**.
- **"Успамін аб матчынай хаце"** (да Дня маці) — да 8 снежня.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Пераможная восень 1943 г."**.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60"**.
- Турыстычна-пазнавальная праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс.: 290 60 10.

- Мастацкая юбілейная выстаўка Анатоля Пятровіча Жураўлева **"Гарызонты"** — да 21 лістапада.
- Мастацкая юбілейная выстаўка Мікалая Мікалаевіча Дундзіна **"Віцебская гісторыя"** — да 21 лістапада.
- Мастацкая выстаўка Сяргея Цімохава, прысвечаная памяці мастака, — да 21 лістапада.
- Мастацкая юбілейная выстаўка Генадзя Баляслававіча Козела **"Штрых-код"** — да 21 лістапада.

УВАГА!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА"

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875
ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.

- **9, 10 — "Папялушка"** С.Пракоф'ева.
- **12 — "Турандот"** Дж.Пучыні.
- **13, 15 — "Бахчысарайскі фантан"** Б.Асаф'ева.
- **14 — "Травіята"** Дж.Вердзі.
- **15 — "Песні 30 — 40-х гадоў"** (Музычныя вечары ў Вялікім Камерная зала імя Л.П. Александроўскай).
- **16 — "Кармэн"** Ж.Бізэ.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл./факс: 227 60 81.

- **9, 10 — "Ноч на Каляды"** паводле М.Гогаля.
- **12, 16 — "Паўлінка"** Янкі Купалы.
- **13 — "Чорная панна Нясвіжа"** А.Дударава.
- **14 — "Офіс"** І.Лаўзунд.
- **15 — "Вячэра з прыдуркамі"** Ф.Вэбера.

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **12 — "Самотны захад"** М.МакДонаха.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

- **9, 14, 15 — "Нязваны госць"** С.Бартохавай.
- **10 — "Адэль"** Я.Таганава.
- **"Воўк-мараплавец"** С.Казлова.
- **11** — Канцэрт Алеся Камоцкага для сяброў.
- **12 — "Раскіданае гняздо"** Янкі Купалы.
- **13 — "Ліфт"** Ю.Чарняўскай.
- **16 — "А мне не сорамна!.."** Л.Усцінава.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

- **9, 10 — "Соф'я Гальшанская"** У.Кандрусевіча.
- **12 — "Праўдзівая гісторыя паручніка Ржэўскага"** В.Баскіна.
- **13 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
- **14 — "12 крэслаў"** Г.Гладкова.
- **15 — "Юнона" і "Авось"** А.Рыбнікава.
- **16 — "Бураціна.BY"** А.Рыбнікава.
- **16 — "Звычайны цуд"** Г.Гладкова.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

- **9 — "Брэменскія музыкі"** В.Ліванава, Ю.Энціна.
- **10, 12 — "Дапытлівы слонік"** паводле Р.Кіплінга.
- **13 — "Дэкамерон"** (імправізацыя на тэмы Дж. Бакача).
- **15 — "Церам-церамок"** паводле С.Маршака.
- **16 — "Воўк і раз, два, тры..."** Н.Мацяш.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыя: **Дзмітрый ФІЛІПОВІЧ (адказны сакратар)**

Рэдактары аддзелаў: **Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН**

Спецкарэспандэнты: **Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ**

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ

Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: (017) 290 22 50, (017) 286 07 97, (017) 334 57 23

Тэлефон-факс: (017) 334 57 41

Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by

E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2013. Індэксы 63875, 638752 Кошт 4500 рублёў.

Наклад 6 853
Падпісана ў друк 08.11.2013 у 15.00
Замова 4723

Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.

Прыёмная: (017) 290 22 50.

Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

QR-код: